АБАРОНА ПАВЕТРАНЫХ АСАЎ 4

ПРАДВЫЗНАЧАНЫ ПАДЗЕЛ 9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

17 ЖНІЎНЯ 2024 г. СУБОТА № 160 (30294)

КАРАТКА

• **ВУП Беларусі ў студзені–ліпені вырас на 5,5 працэнта.**

• 93,5 тыс. шматдзетных сем'яў ужо атрымалі дапамогу на падрыхтоўку дзяцей да навучальнага года.

• **У Беларусі з улікам рапсу намалацілі больш як 7,4 млн т збожжа.**

• Аб'ём прамысловай вытворчасці ў студзені–ліпені склаў Br116,8 млрд, або ў супастаўных цэнах 107,5 працэнта да ўзроўню студзеня–ліпеня мінулага года.

• **Пасажыраабарот у студзені–ліпені 2024 года склаў 14 427,9 млн пасажыра-кіламетраў, або 109,2 % да адпаведнага перыяду 2023 года.**

• Рознічны тавараабарот у студзені–ліпені 2024 года склаў Br49,4 млрд, або 111,8 працэнта ў супастаўных цэнах да ўзроўню аналагічнага перыяду 2023 года.

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый КРУТОЙ, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Усе важныя сацыяльныя праграмы і праекты, звязаныя з добраўпарадкаваннем і капітальным рамонтам нашых сацаб'ектаў, безумоўна, павінны ўвайсці ў графік па выніках дзевяці месяцаў. Ва ўмовах складаных, фактычна мабілізацыйнай эканомікі Прэзідэнтам былі прыняты рашэнні па перараз меркаванні часткі дадатковых бюджэтных даходаў менавіта на сацыяльную сферу. Яны распісаны па абласцях і ў кожнай вобласці размеркаваны па раёнах».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ДЛЯ АДБІЦЦЯ ВЕРАГОДНЫХ ПАСКУДСТВАЎ У ДАЧЫНЕННІ ДА БЕЛАРУСІ Ў НАС ЁСЦЬ УСЁ»

Фота БелТА.

У прэзідэнцкі графік на пятніцу была ўключана нарада па пытаннях ваеннай бяспекі. У кабінет да кіраўніка дзяржавы былі запрошаны дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Беларусі Аляксандр Вальфовіч, міністр абароны Віктар Хрэнін, начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл Павел Муравейка і намеснік начальніка Генштаба Уладзімір Купрыянюк.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь даўно знаходзіцца ў цэнтры геастратэгічных інтарэсаў нашай планеты. «Гэта адна з прычын нарастання напружання і напружанасці каля нашых граніц. Плюс да таго, мы гэта даўно бачым, за межамі нашай краіны, асабліва з ліку збеглых, якія пакінулі Беларусь, фарміруюцца рознага кшталту харугвы і, як яны гучна называюць, «палкі», цэлыя карпусы для таго, каб у пэўны перыяд уварвацца ў Беларусь, узяць уладу і павярнуць краіну назад. Ведаючы гэта, мы заўсёды рыхтаваліся да супрацьдзеяння гэтым людзям, асабліва па лініі спецслужбаў, ды і па лініі Узброеных Сіл і найперш арміі», — сказаў ён. Прэзідэнт заўважыў, што міністр абароны, дзяржсакратар Савета Бяспекі і старшыня КДБ дакладваюць, што Беларусь гатова супрацьдзейнічаць любым пагрозам. «Я так разумею, для адбіцця верагодных паскудстваў (я не хачу сказаць — нападаў, удараў) у дачыненні да Беларусі ў нас ёсць усё», — удакладніў кіраўнік дзяржавы.

Пытанні ваеннай бяспекі абмеркавалі ў Палацы Незалежнасці

Другое пытанне, узнятае Прэзідэнтам, — сітуацыя на беларуска-ўкраінскай граніцы. Пасля парушэння паветранай прасторы Беларусі ўкраінскімі беспілотнікамі 9 жніўня кантроль на беларуска-ўкраінскай граніцы быў узмоцнены. Туды выведзены некаторыя часці арміі. «Якая цяпер абстаноўка на граніцы? Ці ўсе падраздзяленні вывелі ў раён канцэнтрацыі войска на непрадбачаны выпадак. Як там абстаноўка? — паставіў пытанні Аляксандр Лукашэнка. — Я прашу далажыць не толькі абстаноўку, але і развіццё сітуацыі, вашы прапановы. Што будзем рабіць далей?»

СТАР. 2

Па сутнасці справы

Вітаем, маладое папаўненне!

У жніўні традыцыйна пачынаюць свой працоўны шлях тысячы выпускнікоў універсітэтаў і каледжаў

Момант хвалюючы, і з двух «выпускаў» у дарослае жыццё — спачатку пасля школы, затым пасля заканчэння ВНУ — гэты, сапраўды, самы сур'ёзны. Побач няма педагогаў, майстроў і, часцей за ўсё, бацькоў. Ёсць арганізацыя і твая частка работы, за якую нясеш зусім дарослую і сур'ёзную адказнасць. Цяжка? Канешне. Таму менавіта ў гэты момант многае залежыць ад кіраўніка і калег маладога спецыяліста: як яго прымуць, як падтрымаюць, як дапамогуць уключыцца ў працу. І ад гэтых жа фактараў залежыць, вырасце ў сваім калектыве з маладога спецыяліст высакакласны ці ён пакіне, нягледзячы на ўсе наступствы, сваё першае працоўнае месца, расчараваны ў выбары і прафесіі.

СТАР. 6-7

Фота БелТА.

Газета — чытач

ЗБЕРАГЧЫ І ЗАХАВАЦЬ

Пра што варта памятаць садоўніку-аматару, каб не згубіць сваю працу

Жнівень ужо пераваліў за палову, а значыць, для дачнікаў і ўладальнікаў прысядзібных участкаў набліжаецца важны жыццёвы этап — збор ураджаю. Убраць кожную садовую ці агародную культуру важна своечасова і — самае галоўнае — правільна яе захаваць. Пра гэта і пішуць у «Звязду» нашы любімыя чытачы, садоўнікі і агароднікі. А мы, у сваю чаргу, пераадрасоўваем іх пытанні навукоўцам.

СТАР. 8

«ДЛЯ АДБІЦЦЯ ВЕРАГОДНЫХ ПАСКУДСТВАЎ У ДАЧЫНЕННІ ДА БЕЛАРУСІ Ў НАС ЁСЦЬ УСЁ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кіраўнік дзяржавы растлумачыў: гэта нарада не для таго, каб паглыбіцца ў размову аб праблемах арміі. Па яго словах, тэма будзе абмяркоўвацца пазней. «А вось гэта канкрэтнае пытанне, звязанае з беларуска-ўкраінскай граніцай: мінуў пэўны час, і наколькі сур'ёзна тое, што адбываецца там з боку Украіны?» — удакладніў беларускі лідар.

Міністр абароны Віктар Хрэнін далажыў, што абстаноўка на паўднёвым аперацыйным напрамку застаецца напружанай: «Фарміраванні ўзброеных сіл пагранічнай службы Украіны працягваюць удасканальваць сістэмы аховы граніцы і элементаў эшалаванай абароны. На ўсіх участках уздоўж дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь адзначаецца актыўная дзейнасць сіл спецыяльных аперацый і службаў бяспекі Украіны. Бесперапынна вядзецца разведка, для чаго выкарыстоўваюцца беспілотныя лятальныя апараты, у тым ліку са спробамі парушэння нашай паветранай прасторы. Ва ўмовах прысутнасці ўкраінскіх узброеных фарміраванняў у прыгранічных раёнах захоўваецца высокая верагоднасць падрыхтоўкі і правядзення на нашай тэрыторыі ўзброеных правакацый, а таксама рэзанансных акцый, у тым ліку з задзейнічаннем беларускіх нацыяналістычных фарміраванняў».

Фота БелТА

❍ У тэму

УЗБРОЕНЫЯ СІЛЫ ГАТОВЫ АДЭКВАТНА РЭАГАВАЦЬ НА ПРАВАКАЦЫІ І ВЫКЛІКІ

Начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл Павел МУРАВЕЙКА расказаў журналістам, што на нарадзе былі абмеркаваны ўмовы, фактары, пагрозы, якія канцэнтруюцца на паўднёвым аперацыйным напрамку ўздоўж паўднёвай граніцы. «Абстаноўка, скажу шчыра, няпростая. Канцэнтрацыя войскаў, мерапрыемствы, якія праводзяцца ўкраінскім бокам у нашым прыгранічча, дзеянні, якія сёння выклікалі рэзананс сусветнага маштабу на курскім напрамку, прымушаюць нас задумацца, ці можам мы супрацьдзейнічаць падобным выклікам і пагрозам», — сказаў ён. Па словах Паўла Муравейкі, Прэзідэнт канкрэтна спытаў кіраўніцтва ваеннага ведамства, да чаго мы гатовы і як будзем процідзейнічаць. «Узброеныя Сілы гатовы выконваць задачы і адэкватна рэагаваць на любыя правакацыі і выклікі супраць нашых граніц і нашай дзяржавы», — запэўніў начальнік генштаба.

Журналісты згадалі, што месяц таму беларускі бок ужо ўмацоўваў беларуска-ўкраінскую граніцу. Пасля зняцця напружання сітуацыя нармалізавалася. Прадстаўнікі СМІ пацікавіліся, ці супастаўнае цяперашняе ўмацаванне граніцы з тым, што было ў пачатку ліпеня. «Тая маштабная рэзанансная правакацыя, якая праведзена ўкраінскімі ўзброенымі сіламі на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, у прыватнасці ў Курскай вобласці, прымусіла нас перагледзець склад сіл і сродкаў, якія мы прыцягваем для забеспячэння нашай бяспекі. Мы нарасцілі групоўку супрацьпаветранай абароны, таму што фактары залёту ў нашу паветраную прастору беспілотных лятальных апаратаў пачасціліся. Мы стварылі неабходныя ўмовы для разгортвання груповак цяжкай тэхнікі. Мы адэкватна гатовы адрэагаваць на правакацыі, падобныя тым, што адбыліся ў Курску. Мы кантралюем нашу дзяржаўную граніцу, нарасцілі сілы і сродкі разведкі. Вядзём стварэнне пэўных запасаў і магчымасцяў для стварэння і разгортвання груповак. Аб'ектыўна магу адзначыць, што сёння той склад сіл і сродкаў, які выведзены на граніцу, большы, чым той, які быў створаны раней. Ён забяспечвае адэкватнае супрацьдзеянне любым выпадам і любым правакацыям», — адказаў Павел Муравейка.

Валерыя СЦЯЦКО.

ПРА НОВАЕ СКЛІКАННЕ І СПРАВЫ Ў СТАЛІЦЫ

Прэзідэнт прыняў з дакладам Наталлю Качанаву

Фота БелТА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам Старшыню Савета Рэспублікі Наталлю Качанаву. Яна таксама з'яўляецца ўпаўнаважаным Прэзідэнта па Мінску. Таму кіраўнік дзяржавы пачаў размову з пытанняў, якія датычыцца сталіцы. Асабліва яго цікавіла эканамічная сітуацыя ў горадзе, работа прадпрыемстваў, у прыватнасці Мотавелазавода. Прэзідэнт таксама цікавіўся работай новага склікання Савета Рэспублікі і міжнароднай дзейнасцю парламентарыяў.

Наталля Качанава далажыла, што Савет Рэспублікі новага склікання правёў ужо чатыры пасяджэнні, прыняты 31 законапраект. «Уключыліся ўсе ў работу даволі актыўна, працуем з людзьмі, разглядаем тыя законапраекты, якія прадстаўлены нам на экспертным савеце. Работа вядзецца актыўна па ўсіх кірунках», — адзначыла яна.

Размаўляючы з журналістамі пасля даклада ў Прэзідэнта, Наталля Качанава заўважыла, што склад Савета Рэспублікі абнавіўся, але характар работы не змяніўся: у цэнтры ўвагі сенатараў — дзейнасць над законапраектамі, работа з людзьмі, міжнародная дзейнасць. Не спыняецца работа членаў Савета Рэспублікі з насельніцтвам, праводзяцца асабістыя прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі, сустрэчы ў працоўных калектывах. «За чатыры месяцы мы правялі больш за 470 сустрэч у працоўных калектывах, да нас паступіла больш за дзве тысячы зваротаў, прайшло 108 тэлефонных ліній. Штомесяц усе члены Савета Рэспублікі праводзяць прыёмы па асабістых пытаннях», — прывяла лічбы спікер. Паводле яе слоў, работа з насельніцтвам важная і для работы над законапраектамі: «Як гаворыць наш Прэзідэнт: «законы павінны быць ад зямлі». Роўна так мы імкнёмся працаваць над законапраектамі».

Наталля Качанава таксама звярнула ўвагу, што з сямі членаў Савета Рэспублікі, якія працуюць на прафесійнай аснове, ёсць упаўнаважаныя Прэзідэнта па Брэсцкай, Магілёўскай абласцях і Мінску. «Я як упаўнаважаны па Мінску далажыла Прэзідэнту аб выкананні яго даручэнняў. Перш за ўсё гэта датычылася тых прадпрыемстваў, якія наведваў Прэзідэнт і дзе ім былі пастаўлены адпаведныя задачы. Гэта Мотавелазавод, МАЗ, «Гарызонт». Мы сёння вядзём кантроль за дзейнасцю гэтых прадпрыемстваў, за рэалізацыяй праектаў. Хачу сказаць, усё ідзе па графіку, нават з апярэджаннем графіка. Мы спадзяёмся, што ў найбліжэйшы час, у 2025 годзе, «Мотавела», як і было абяцана, запрацуе на поўную магутнасць. І не толькі само прадпрыемства, але і тыя рэзідэнты, якія ўключаны ў тэхнапарк», — распавяла Наталля Качанава. Што датычыцца выканання прагнозаў сацыяльна-эканамічнага развіцця, то, паводле яе слоў, горад Мінск выканаў усе даведзеныя заданні, па некаторых пазіцыях нават з апярэджаннем. «Але разам з тым самазаспакойвацца нельга. Мы разумеем, што трэба працаваць, прырастаць. І ў сталіцы мы павінны паказваць дастойныя вынікі. Таму што сегмент Мінска ў эканоміцы краіны значны», — адзначыла Наталля Качанава.

Валерыя СЦЯЦКО.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Кітаі заявілі, што не збіраюцца ўдзельнічаць у ядзернай гонцы ўзбраенняў з ЗША

Кітайскія ўлады не будуць нарошчваць баявы ядзерны патэнцыял для ўдзелу ў гонцы ўзбраенняў з ЗША ці іншымі краінамі. Аб гэтым заявіў афіцыйны прадстаўнік МЗС КНР Лінь Цзянь, паведаміла ТАСС. «Ядзерны арсенал Кітая зусім не стаіць на адным узроўні са Злучанымі Штатамі, — адзначаецца ў каментарыі, апублікаваным на сайце кітайскага знешнепалітычнага ведамства. — КНР заўсёды падтрымлівае свае ядзерныя сілы на мінімальным узроўні, неабходным для забеспячэння нацыянальнай бяспекі. Мы ні з кім не ўдзельнічаем у гонцы ўзбраенняў». Лінь Цзянь нагадаў, што Пекін праводзіць палітыку непрымянення ядзернай зброі першым і прытрымліваецца стратэгіі самаабароны. Ён таксама адмовіўся каментаваць перадвыбарную рыторыку ў ЗША. Як вядома, раней кандыдат у прэзідэнты ЗША ад Рэспубліканскай партыі Дональд Трамп у інтэрв'ю ўладальніку Х Ілану Маску дапусціў, што КНР перасягне Злучаныя Штаты па памеры ядзернага арсенала ў выніку яго нарошчвання.

Германія застаецца найбуйнейшым донарам ЕС

ФРГ у мінулым годзе стала найбуйнейшым чыстым донарам у Еўрасаюзе, значна апярэдзіўшы Францыю. Германія заплаціла ў бюджэт ЕС на 17,4 мільярда еўра больш, чым атрымала ад яго. Пра гэта паведаміла ТАСС, выходзячы з ацэнкі Інстытута германскай эканомікі (IW). У 2022 годзе гэты паказчык склаў 19,7 млрд еўра. На думку IW, прычынай зніжэння стала слабая эканамічная сітуацыя, якая, верагодна, паўплывае і сёлета. Чыстыя выплаты могуць крыху зрушыцца ў бок Іспаніі і Партугаліі, дзе справы ў эканоміцы ідуць лепш, чым у Германіі. Летась Парыж выплаціў амаль на 9 млрд еўра больш, чым атрымаў. Італія знаходзіцца на трэцім месцы з чыстым укладам каля 4,5 млрд еўра. Найбуйнейшым чыстым атрымальнікам летась, як і ў папярэднім годзе, стала Польшча з 8,2 млрд еўра. За ёй ідуць Румынія (6 млрд еўра) і Венгрыя (4,6 млрд еўра). Бюджэт Еўрасаюза ў мінулым годзе склаў 173,1 млрд еўра.

У Афрыцы аб'явілі надзвычайную сітуацыю з-за эпідэміі воспы малпаў

Кіраўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Тэдрас Адханам Гебрэесус аб'явіў эпідэмію воспы малпаў надзвычайнай сітуацыяй у галіне грамадскай аховы здароўя, якая мае міжнароднае значэнне. Аб гэтым паведаміла РІА «Новости». Камітэт па надзвычайных сітуацыях СААЗ сабраўся ў сувязі з сітуацыяй з гэтым захворваннем у Афрыцы. Напярэдадні Афрыканскія цэнтры па кантролі і прафілактыцы захворванняў (CDC) аб'явілі надзвычайную сітуацыю ў галіне аховы здароўя з-за ўспышкі воспы малпаў. Кіраўнік СААЗ паведаміў, што ў мінулым годзе колькасць зарэгістраваных выпадкаў воспы малпаў значна ўзрасла, а сёлета яна перавысіла леташні паказчык — іх ужо зарэгістравалі больш як 14 тысяч і 524 смяротныя. «Выяўленне і хуткае распаўсюджванне новай разнавіднасці воспы малпаў ва ўсходняй частцы Дэмакратычнай Рэспублікі Конга, яе выяўленне ў суседніх краінах, якія раней не паведамлялі аб выпадках воспы малпаў, і патэнцыяльная магчымасць далейшага распаўсюджвання ў Афрыцы і за яе межамі выклікаюць вялікую трывогу», — заўважыў Гебрэесус.

На кантролі

СКЛАДНІКІ КАМФОРТНАГА ЖЫЦЦЯ

Калі яны ёсць — людзі нікуды не з'едуць

Стварэнне і падтрыманне камфортных умоў жыццядзейнасці ў сельскіх населеных пунктах — найважнейшая задача выканаўчай улады, заявіў журналістам Старшыня Палаты прадстаўнікоў — упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Віцебскай вобласці Ігар Сергяенка пасля пасяджэння Пастаўскага райвыканкама, якое прайшло з яго ўдзелам.

Фота БелТА.

На парадку дня пасяджэння — работа па вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва на тэрыторыі Курапольскага сельсавета і работа па развіцці малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў Пастаўскім раёне.

Гаворачы аб першым пытанні, Старшыня Палаты прадстаўнікоў растлумачыў, у сувязі з чым яно вынесена на разгляд. Сельсавет сёлета быў тэрытарыяльна ўзбуйнены. Раней на гэтай тэрыторыі знаходзіліся два сельскія Саветы.

«Гэта 60 населеных пунктаў, тры сельскія гаспадаркі. Пытанні характэрны для многіх населеных пунктаў і раёна, і Віцебскай вобласці, — сказаў Ігар Сергяенка. — Адбываецца старэнне насельніцтва, частка населеных пунктаў проста адыходзіць».

У дачыненні да Курапольскага сельсавета Старшыня Палаты прадстаўнікоў заўважыў, што з 60 населеных пунктаў больш як у 50 працэнтаў не пражывае ніводнага жыхара або пражываюць менш як 10 жыхароў. Тым не менш ёсць тры буйныя аграгарадкі і значная частка вёсак, дзе пражываюць ад 50 да 100 чалавек.

«Пытанні забеспячэння, стварэння камфортных умоў і падтрыманне існуючых на годным узроўні — адна з найважнейшых задач выканаўчай улады, — падкрэсліў Ігар Сергяенка. — Складнікаў забеспячэння камфортнасці жыццезабеспячэння некалькі, у тым ліку жыллё».

Гаворачы аб жыллёвым пытанні, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы заўважыў, што сёння на тэрыторыі сельсавета на чарзе тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, стаяць 46 сем'яў, што сведчыць: людзі ў буйных гаспадарках затрымліваюцца.

Фота БелТА.

Другім складнікам камфортнай жыццядзейнасці Ігар Сергяенка назваў работу гандлю. Аднак тут выказвалася сур'ёзная крытыка. У першую чаргу да спажыўтаварыстваў. У сувязі з гэтым ён заўважыў, што кіраўніцтву Белкаапсаюза трэба звярнуць увагу на работу спажыўкааперацыі ў Віцебскай вобласці, у прыватнасці Пастаўскім раёне, дзе сёння ўдзельная вага спажыўкааперацыі ў цэлым у гандлі складае 5 працэнтаў, шэраг памяшканняў пустуе, многія магазіны закрываюцца.

«Не хачу сказаць, што сітуацыя катастрафічная, але яна даволі крытычная», — заўважыў Ігар Сергяенка.

Што да водазабеспячэння, дастаткова востра стаіць пытанне з будаўніцтвам станцыі абезжалезвання, заўважыў ён. У прыватнасці на тэрыторыі дадзенага сельскага Савета адна станцыя ўступіла ў строй, завяршэнне другой плануецца да канца года. «Па гэтым пытанні людзі таксама звярталіся да мяне ў ходзе асабістага прыёму. Гэта работа будзе прадоўжана на тэрыторыі Пастаўскага раёна і ў наступным годзе», — дадаў ён.

Найважнейшае пытанне — медыцынскае забеспячэнне. Паводле інфармацыі галоўнага ўрача раёна, усе фельчарска-акушэрскія пункты прыведзены ў адпаведны стан. Удасканальваецца матэрыяльна-тэхнічная база раённай бальніцы, будуецца новы корпус, які будзе здадзены ў наступным годзе. У цэлым сур'ёзных нараканняў у плане медыцынскага абслугоўвання няма.

«Наступны складнік — транспарт, дарогі. У гэтым годзе выдзелены значныя сродкі. Практычна ў два разы больш, чым у мінулым. І з улікам рэальнага стану спраў, і з улікам зваротаў грамадзян райвыканкам выбірае ўчасткі, якія неабходна заасфальтаваць, загрэйдзіраваць», — адзначыў кіраўнік Палаты прадстаўнікоў.

Асобную ўвагу ён удзяліў сферы адукацыі. «Мы паглядзім, як завяршаецца падрыхтоўка школ да новага навучальнага года. Да 20 жніўня павінны быць падпісаны ўсе пашпарты гатоўнасці ў школах», — сказаў ён, дадаўшы, што з падвозам школьнікаў пытанняў няма, усё вырашаецца апаратыўна.

«Дастаткова важная тэма — клопат аб пажылых грамадзянах, якія адзінока пражываюць. З сустрэч і паездак па раёне відаць, што гэтыя пытанні вырашаюцца. Працуе раённы цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Аказваецца дапамога, замацаваны сацыяльныя работнікі», — сказаў упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы.

Зрэшты, паводле яго слоў, заклапочанасць выклікае тая група людзей, якая нідзе не працуе. На тэрыторыі сельскага Савета ў банку даных па розных прычынах лічыцца 184 такія чалавекі. З іх, паводле слоў старшыні сельсавета, 32 чалавекі нідзе не працуюць, жывуць за кошт свайкоў, выпадковых заробкаў і патрабуюць павышанай увагі з боку ўлады ў пытанні працаўладкавання.

Што да другога пытання, якое разгледжана на пасяджэнні райвыканкама, Ігар Сергяенка заўважыў, што 45 працэнтаў бюджэту раёна фарміруюць падатковыя адлічэнні ад прадпрымальніцкай дзейнасці. Ён адзначыў, што сёлета ўступаюць у сілу змены заканадаўства, якія рэгламентуюць прадпрымальніцкую дзейнасць. Некаторыя індывідуальныя прадпрымальнікі павінны вызначыцца і ў адпаведнасці з законам прыняць для сябе рашэнне перайсці ў іншы статус.

Упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Віцебскай вобласці падкрэсліў правільнасць таго, што на пасяджэнне былі запрошаны прадстаўнікі найбольш буйных кампаній і аб'ектаў на тэрыторыі раёна, якія маглі выказаць сваё меркаванне.

«Я ўбачыў, што пытанне ўлада трымае на кантролі, праводзіцца тлумачальная работа. Вызначыцца, у якую форму перайсці, засталося 25 індывідуальным прадпрымальнікам», — сказаў Ігар Сергяенка.

У цэлым, зазначыў ён, пытанні, якія выносіліся на пасяджэнне райвыканкама, важныя. Камфортныя ўмовы жыцця насельніцтва сведчаць аб клопаце дзяржавы аб пенсіянерах, старых, але таксама дазваляюць замацоўваць кадры.

Што да ўборачнай кампаніі, работы ў Пастаўскім раёне завяршаюцца, адзначыў упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы. Паводле яго слоў, заканчэнне плануецца да 20 жніўня. Пастаўскі раён уваходзіць у пяцёрку лідараў па ўборцы. Сярэдняя ўраджайнасць — звыш 25 ц/га. Засталося некалькі пагодлівых дзён, і ўсе работы будуць завершаны, падкрэсліў Ігар Сергяенка.

Паводле БелТА.

БУЛЬДОЗЕР, ЭКСКАВАТАР, ХАРВЕСТАР — ЗРОБЛЕНА Ў БЕЛАРУСІ!

Учора холдынг «Амкадор» уладзіў прэзентацыю сваёй новай прадукцыі — доследныя ўзоры машын і тыя, што пастаўлены ўжо на серыйную вытворчасць. Сярод іх — бульдозер, экскаватар, розныя віды пагрузчыкаў, харвестар. За сем месяцаў гэтага года створана 10 навінак машын, і сёння гэтыя машыны праходзяць выпрабаванні і падрыхтаваны да серыйнай вытворчасці. Колькасць дэталяў, вузлоў і агрэгатаў, якія вырабляюцца прадпрыемствамі холдынга, штогод павялічваецца, працэнт лакалізацыі ўласнымі камплектуючымі становіцца ўсё большы. Холдынг з'яўляецца адзіным вытворцам на тэрыторыі краін СНД лесанарыхтоўчых машын і ўваходзіць у тройку сусветных вытворцаў па наменклатуры прадукцыі, што выпускаецца.

З новымі машынамі азнаёміўся ўчора прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА.

Фота Вітгара ІВАНЬКАВА.

Запрашальнік

У БАРАНАВІЦКІМ КРАІ — СВЯТА КНІГІ

17 жніўня дарослыя і дзеці збіраюцца на фестываль дзіцячай кнігі ў вёсцы Новая Мыш

Па праве звычайную вёску паблізу Баранавіч можна на адзін дзень назваць сталіцай дзіцячай кнігі Беларусі. У Новую Мыш Баранавіцкага раёна са сваімі новымі кнігамі да чытача ў гэты дзень наведаюцца лаўрэат многіх літаратурных прэмій, старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхась Пазнякоў, аўтар цікавых кніг для школьнікаў-пачаткоўцаў Валянціна Драбышэўская, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь аўтар кнігі казак «Дзед Манюкін і ўнукі» Васіль Шырко, паэты і празаікі Іна Фралова, Дзмітрый Мікалаеў.

Са сваімі новымі героямі пазнаёмяць удзельнікаў кніжнага свята Валерый Квілорыя, Тамара Кавальчук, Таццяна Дземідовіч, Наталля Кандрашук. Аўтографсесіі правядуць Кацярына Хадасевіч-Лісавая, Таццяна Яцук і іншыя пісьменнікі з Мінска і самых розных куткоў Беларусі.

Арганізатары фестывалю дзіцячай кнігі «Роднай Мышанкі абшары» — Баранавіцкі раённы выканаўчы камітэт, Брэсцкае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкі дом «Звязда».

Сяргей ШЫЧКО.

ПАД АБАРОНАЙ ПАВЕТРАНЫХ АСАЎ

Чым жыве 50-я змешаная авіяцыйная база і якія задачы ўскладзены на лётны састаў?

Гарадскі пасёлак Мачулішчы, які знаходзіцца недалёка ад Мінска, у народзе даўно лічыцца ваенным. І хоць жыхарамі населенага пункта з'яўляюцца не толькі людзі ў пагонах, суседства з праслаўленым воінскім злучэннем — 50-й змешанай ордэна Чырвонай Зоркі авіяцыйнай базай — замацавала за пасёлкам неафіцыйны статус лётнага гарадка. Тут даўно прызвычаіліся да гулу матораў і лопасцяў вінтакрылых машын. Аднак, як ні дзіўна, жыхары Мачулішчаў спяць спакойна: яны, як ніхто ведаюць, што неба над Беларуссю знаходзіцца пад пільнай увагай і надзейнай абаронай прафесіяналаў.

Камандзір 50-й змешанай авіяцыйнай базы палкоўнік Уладзімір СКОРКІН.

Народжаная Афганам

Напярэдадні Дня Ваенна-паветраных сіл карэспандэнты «Звязды» наведалі праслаўленае злучэнне, якое ў наступным годзе адзначыць сваё 45-годдзе. Дарэчы, гісторыя стварэння воінскай часці шчыльна звязана з падзеямі ў Афганістане. З мэтай аказання інтэрнацыянальнай дапамогі афганскаму народу ў пачатку 1980 года на тэрыторыі Узбекскай ССР быў сфарміраваны 50-ы асобны змешаны авіяцыйны полк. Адзіны з усіх авіяцыйных часцей, якія бралі ўдзел у баявых дзеяннях у Афганістане. За паспяховае выкананне заданняў па аказанні інтэрнацыянальнай дапамогі і высокія паказчыкі ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы авіяполк быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

У Афганістане лётчыкі злучэння здзейснілі 120 944 баявыя вылеты, у ходзе якіх было знішчана каля 3,5 тысячы душманаў, 298 апорных пунктаў, 236 лагераў мяцежнікаў і крэпасцяў, 160 агнявых кропак, 104 пазіцыі ворага, 75 складоў са зброяй і боепрыпасамі, перавезена 90 тысяч тон грузаў, каля 700 тысяч чалавек. Баявымі ўзнагародамі і медалямі былі ўзнагароджаны 4133 ваеннаслужачыя авіяпалка, восем з іх былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Новая старонка ў гісторыі воінскай часці пачалася ў маі 1989 года, калі авіяполк быў перабазіраваны ў Беларусь, на аэрадром «Ліпкі». У маі 1994 года злучэнне перадыслакавалася на аэрадром «Мачулішчы» і атрымала новую назву — 50-й авіяцыйнай базы. Прыстаўка «змешаная» ў воінскай часці з'явілася ў жніўні 2022 года.

Адказная місія і шлях да першакласнасці

Сёння 50-я змешаная авіяцыйнай база — гэта не толькі аэрадром і ўся неабходная інфраструктура, якая забяспечвае выкананне пастаўленых задач, але і ўнікальны лётны цэнтр, дзе ажыццяўляецца бесперапынная падрыхтоўка асабовага складу. Тут лётчыкі і іншыя спецыялісты, без якіх нельга ўявіць ні адзін палёт, праводзяць большую частку свайго часу. На тэрыторыі воінскай часці лётчыкі харчуюцца, удасканальваюць сваю фізічную форму, шануюць традыцыі сваіх папярэднікаў — на тэрыторыі базы, у сапраўдным самалёце, размяшчаецца ўнікальны музей. Ёсць і Алея Герояў, і нават свая капліца. Усё зроблена для таго, каб вялікай лётнай сям'і служылася максімальна камфортна.

У першую чаргу аб гэтым клапоціцца **камандзір 50-й змешанай авіяцыйнай базы палкоўнік Уладзімір СКОРКІН.** Як сапраўды гаспадар, ён гасцінна сустракае журналістаў і адразу ўводзіць у курс справы.

50-я авіябаза — адзінае злучэнне Узброеных Сіл нашай краіны, дзе канцэнтруецца ўся транспартная ваенная авіяцыя. Адпаведна на воінскае злучэнне ўскладзены сур'ёзныя задачы. Людзі, якія тут служаць, нясуць баявое дзяжурства па абароне паветраных рубяжоў нашай краіны, забяспечваюць высокую мабільнасць войск, выконваюць перамяшчэнне грузаў, удзельнічаюць у пошукава-ратавальных аперацыях, ажыццяўляюць падрыхтоўку лётнага саставу.

Транспартныя задачы, якія выконваюцца ваеннаслужачымі воінскай часці, нярэдка выходзяць на міждзяржаўны ўзровень. Менавіта лётчыкі 50-й авіябазы дастаўлялі гуманітарныя грузы нашым кітайскім сябрам, якія першымі сутыкнуліся з пандэміяй COVID-19. Яны ж прывезлі кітайскую вакцыну ад каранавіруснай інфекцыі беларусам. Калі ў Турцыі і Сірыі здарылася землетрасенне, ваенныя авіятары дастаўлялі ў пацярпелыя раёны нашых ратавальнікаў і ўрачоў. І гэта толькі малая кропля вялікай гуманітарнай місіі лётчыкаў у пагонах.

«Дзяжурствы, дзяжурствы і яшчэ раз дзяжурствы — рознай ступені гатоўнасці, — кажа аб прыярытэтнай задачы, якая стаіць перад праслаўленым злучэннем, Уладзімір Скоркін. — Галоўная задача, якая стаіць перад камандзірам, — падтрыманне дасягнутага ўзроўню. Ніжэй гэтай планкі ні ў якім разе апускацца нельга. У авіяцыі няма такога: дасягнуў пэўнага ўзроўню, і на тым усё. Пастаянна ідзе працэс удасканалення лётнага саставу, якому няма мяжы. Паказчыкам удасканалення з'яўляецца класнасць кваліфікацыі. Мая мара — каб усе лётчыкі былі першага класа».

Курсанту, які прыходзіць у авіяцыю пасля заканчэння Ваеннай акадэміі, давядзецца прыкласці шмат намаганняў, каб стаць першакласным лётчыкам. Гэта не адзін год добрасумленнай службы, калі ўлічваецца і колькасць гадзін налёту, і ўзровень падрыхтоўкі. Лётчык першага класа павінен выконваць задачы ў любых метэаўмовах, і днём, і ноччу. Асобныя прафесіяналы становяцца лётчыкамі-снайперамі, а гэты статус патрабуе асаблівых намаганняў.

На баявым дзяжурстве — сучасная тэхніка і вопытныя спецыялісты

Ваеннаслужачыя 50-й змешанай авіяцыйнай базы нясуць кругласутачнае баявое дзяжурства на тэрыторыі ўсёй краіны. У мінімальна кароткі час, і днём, і ноччу, у любых метэаўмовах лётны экіпаж гатовы вылецець і выканаць пастаўленыя задачы. Ва ўмовах рэгулярнага парушэння паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь ваенныя авіятары працуюць без прамаруджвання: падымаюцца ў неба пры любым падазрэнні на малахуткасныя лятальныя апараты. Хоць дэзынфармаваць могуць і птушкі, і метэаўтварэнні, але ў любым выпадку лётчыкі падымуцца ў неба, каб разабрацца, рэальная гэта пагроза або не.

Несці баявое дзяжурства максімальна якасна асабоваму складу дапамагае высокамабільная сучасная тэхніка. Арсенал авіябазы рэгулярна папаўняецца новымі тыпамі баявых машын. Камандзір адзначае, што верталёты, якія знаходзяцца на ўзбраенні 50-й змешанай авіяцыйнай базы, а значыць, у цэлым Узброеных Сіл, адпавядаюць запытам, якія стаяць перад айчыннай авіяцыяй. У 2017 годзе поўнасцю абнавіўся парк верталётаў Мі-8МТВ-5. У страі — і верталёты Мі-24, восем абсалютна новых верталётаў Мі-35. У найбліжэйшы час чакаецца пастаўка яшчэ чатырох такіх верталётаў — у выніку будзе сфарміравана цэлая эскадрылля.

Па словах Уладзіміра Скоркіна, верталёт Мі-35 вельмі добра сябе зарэкамендаваў. Нягледзячы на шырокі спектр задач, які ён можа выконваць, асноўная з іх — агнявая. Пры гэтым верталёт не пераборлівы, можа ажыццяўляць пасадку ў любым месцы. Увесь асабовы склад асвоіў гэты тып верталёта — адпаведную падрыхтоўку авіятары прайшлі ў Расійскай Федэрацыі.

Што датычыцца падрыхтоўкі лётчыкаў, гэта працэс беспарапынны. Вопыт ваенных канфліктаў, у тым ліку спецыяльнай ваеннай аперацыі, увесь час уносіць карэкціроўкі ў навучальны працэс. «Наладжана шчыльнае ўзаемадзеянне з авіяцыйным складнікам Расійскай Федэрацыі, праводзяцца сумесныя вучэнні, — канкрэтызуе камандзір 50-й змешанай авіябазы. — Нядаўна расійскія калегі прымалі ўдзел у парадзе ў Мінску з нагоды 80-годдзя вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, лётны састаў у тым ліку базіраваўся на аэрадроме «Мачулішчы». Гэта ўнікальная магчымасць узаемадзеяння, калі калегі напрамую маглі абмеркаваць пытанні, якія іх хвалююць, падзяліцца вопытам».

Годная змена

Лётная прафесія па-ранейшаму застаецца папулярнай у маладых людзей. Але, як гэта было заўсёды, паступіць на авіяцыйны факультэт Ваеннай акадэміі няпроста: трэба мець першую групу здароўя і добра вучыцца. Лётчыкі — гэта штучныя кадры, а таму ўвага да маладых спецыялістаў прыкавана з курсанцкай лаўкі. Больш блізка са сваімі юнымі калегамі ваеннаслужачыя 50-й авіябазы знаёмяцца на выпускным курсе, падчас трохмесячнай практыкі. Дагэтуль курсанты авіяцыйнага факультэта стажыруюцца ў аэраклубах ДТСААФ. Па прыбыцці на практыку ў воінскі калектыў будучыя лётчыкі асвойваюць верталёты Мі-8-МТВ-5 і Мі-24. З наступнага года лейтэнанты адразу будуць вучыцца лятаць на новых Мі-35.

Здароўю авіятараў заўсёды ўдзялялася асаблівая ўвага. Добрае харчаванне, рэжым працы і адпачынку, абавязковы водпуск — за гэтым тут строга сочаць. Асартымент харчавання значна пашыраны (карэспандэнты пераканаліся падчас абеду). Раз у год праходзяць урачэбна-лётную камісію і раз у паўгода — паглыблены медыцынскі агляд. Калі нешта не так са здароўем, з высокакваліфікаванымі спецыялістамі не спяшаюцца развітвацца: ваеннаслужачым прапануюць іншую работу.

Клапоцяцца тут і аб патрыятычным выхаванні моладзі. У 2022 годзе на тэрыторыі злучэння быў створаны адзін з першых ваенна-патрыятычных клубаў ва Узброеных Сілах «Сокал». Каля 180 хлопцаў і дзяўчат з Мачулішчаў і прылеглых населеных пунктаў спасцігаюць на тэрыторыі авіябазы азы ваеннай прафесіі, маюць магчымасць назіраць за службай лётчыкаў, дзякуючы ім знаёмяцца са славутасцямі Беларусі. Ваеннаслужачыя спадзяюцца, што ў будучыні хтосьці з іх юных падапечных папоўніць лётныя шэрагі.

Любоў да неба — з дзяцінства

Без рэгулярнага кіравання баявой машынай прафесійны лётчык хутка можа страціць кваліфікацыю. Нягледзячы на вялікую колькасць задач, знаходзіць час для палётаў і камандзір 50-й змешанай авіябазы. Уладзімір Скоркін — лётчык першага класа, лётчык-інструктар — праз яго рукі праходзяць вопытныя авіятары, якія дзеляцца прафесійным майстэрствам са сваімі калегамі.

Стандартны дзень у камандзіра пачынаецца ў шэсць гадзін раніцы: пакуль афіцэр збіраецца на службу, аператыўны дзяжурны дакладвае яму па тэлефоне аб абстаноўцы за мінулую ноч. Па прыбыцці ў воінскую часць Уладзімір Скоркін аб'язджае ўсю тэрыторыю: асабіста правярае, як арганізавана ахова аэрадрома, стан аэрадрома і прылеглай тэрыторыі. У восем раніцы ён ужо ў кабінеце. Па закрытых каналах сувязі ўдакладняе стан спраў, заслухоўвае даклад аб становішчы спраў у воінскай часці, ставіць задачы на дзень. Затым канталюецца іх выкананне, адбываецца ўзаемадзеянне з асабовым складам, ідзе працэс навучання. Камандзір паглыблены ў пытанні, якія хвалююць воінскі калектыў, робіць усё для таго, каб папамагчы кожнаму, хто мае патрэбу. Клопаты займаюць вялікую колькасць часу і забіраюць сілы, але для чалавека, які жыве сваёй прафесіяй, гэта толькі ў радасць.

Лятаць Уладзімір Скоркін марыў з дзяцінства. Як ён сам кажа — выхаваны аэрадромам. Нарадзіўся ў Пскове, у сям'і ваеннаслужачага. Калі яму быў год, бацьку, лётчыка транспартнай авіяцыі, перавялі ў асобны полк ваенна-транспартнай авіяцыі ў Віцебск. Так Уладзімір Скоркін назаўсёды застаўся ў Беларусі, якая стала для яго другой Радзімай. У 15 гадоў будучы камандзір пачаў наведваць віцебскі аэраклуб і праз год асвоіў верталёт Мі-2. Так атрымалася, што шаснаццацігадовы школьнік-аматар вучыў тонкасцям лётнага майстэрства курсантаў Ваеннай акадэміі, якія ўпершыню прыехалі ў аэраклуб на практыку. А неўзабаве і сам паступіў на авіяцыйны факультэт галоўнай ваеннай ВНУ Беларусі.

Пасля заканчэння Ваеннай акадэміі служыў у 276-й верталётнай базе пад Полацкам, затым — у 181-й верталётнай базе ў Пружанах, дзе прайшоў шлях ад лётчыка-аператара да камандзіра эскадрыллі. У 2015 годзе база ў Пружанах была расфарміравана, і Уладзіміра накіравалі вучыцца ў Ваенную акадэмію, на камандна-штабны факультэт. У 2017-м Уладзімір Скоркін прыйшоў у 50-ю авіябазу на пасаду камандзіра эскадрыллі.

Прайшоўшы розныя ступені службовай лесвіцы, з 2022 года лётчык першага класа з'яўляецца камандзірам гэтага праслаўленага злучэння, а разам з тым — высокім прафесіяналам, руплівым гаспадаром, надзейным таварышам для калег. Як ён сам прызнаецца, у паветры не існуе званняў. Ёсць адданасць Радзіме, упэўненасць у правільнасці выканання задач, давер да сваёй каманды і любоў да прафесіі, якая з'яўляецца прызваннем.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Дзеля памяці

«КОЖНЫ ДЗЕНЬ ЗЯМЛЯ ВЫДАВАЛА НОВЫХ АХВЯР...»

У Гродзенскай вобласці пошук загінулых байцоў вялі па нямецкіх фотаздымках

Беларускія пошукавікі знайшлі каштоўныя здымкі на архіўным інтэрнэт-аўкцыёне роўна год таму. Гэта кадры першых тыдняў вайны, калі савецкія войскі з вялікімі стратамі адступалі пад націскам ворага. Як відаць, немцы любілі здымаць сваіх салдат на жудасным фоне. Вядома, былы ваенны ландшафт значна змяніўся, па-іншаму выглядае мясцовасць. Але ўдзельнікі міжнароднай пошукавай Вахты Памяці змаглі па тых ці іншых дэталях знайсці масавыя месцы пахавання савецкіх вайскоўцаў і мірных жыхароў.

У ПОШУКАХ РАЗГРОМЛЕНАЙ КАЛОНЫ

Патрыятычная акцыя «Беларусь памятае: эстафета Памяці» доўжыцца не адзін год і аб'ядноўвае пошукавыя атрады Беларусі і Расіі. На раскопкі ў нашу краіну прыязджаюць прадстаўнікі Масквы, Валагодскай, Архангельскай і Свярдлоўскай абласцей, Удмуртыі, Татарстана. Арганізатары акцыі — 52-і асобны спецыялізаваны пошукавы батальён Узброеных Сіл Беларусі пры ўдзеле пошукавай групы «Бацькаўшчына». Мэта адна: падняць астанкі загінулых воінаў і па магчымасці знайсці іх імёны. Чарговы, чацвёрты, этап завяршыўся на мінулым тыдні. Месцам правядзення раскопак сталі Слонімскі, Зэльвенскі і Свіслацкі раёны.

Падчас раскопак.

Як кажа **намеснік камандзіра 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Узброеных Сіл Аляксандр КРЭМЯНЕЎСКІ**, работа вялася на працягу тыдня, і кожны дзень зямля выдавала новых ахвяр нямецкай агрэсіі. Мяркуецца, яны загінулі пры прарыве падчас акружэння на Беластоцкім выступе ў чэрвені—ліпені 1941 года. Пад Слонімам калона савецкіх вайскоўцаў была разбіта нямецкай авіяцыяй. Людзей хавалі ў варонках ад авіябомбаў ці проста па-абапал дарог. На нямецкіх здымках ёсць фота калоны падчас тых абстрэлаў. Па іх, дарэчы, і вызначаліся месцы раскопак. Вось ужо некалькі гадоў вядзецца пошук той разгромленай калоны.

— Гэта санітарныя пахаванні, бо яны не выконваліся з пэўнымі патрабаваннямі, — расказвае прадстаўнік батальёна. — Немцы прымушалі гэта рабіць палонных байцоў альбо мясцовых жыхароў. Для такіх мэт часцей за ўсё выбіралі варонкі ад снарадаў ці траншэі па-абапал дарог. Часта глыбіня была невялікая.

У першы дзень пошукавай работы на гэтым участку мясцовасці былі вызначаны тры лакацыі для раскопак — каля вёскі Азярніца Слонімскага і Кашалі Зэльвенскага раёнаў. Быў знойдзены першы смяротны медальён. Праўда, з-за дрэннай герметызацыі ўкладыш поўнасцю сапрахнеў, і прачытаць запісы на ім не ўдалося.

Па словах **кіраўніка пошукавай групы «Бацькаўшчына» Аляксандра ДУДАРОНКА**, медальёны выклікаюць асаблівыя пачуцці ва ўдзельнікаў экспедыцыі, бо знаходкі могуць вярнуць загінулага вайскоўца з небыцця, а гэта значыць, яго імя з'явіцца на памятным мануменце, і, хто ведае, можа, пашанцуе знайсці каго-небудзь з яго нашчадкаў альбо сваякоў. Такія цуды таксама здараюцца.

Праўда, знайсці тыя капсулы ўдаецца нашмат радзей, чым хацелася б. Вось і пры эксгумацыі 23 байцоў і камандзіраў у Слонімскім раёне было знойдзена толькі чатыры смяротныя медальёны. Адзін укладыш адсутнічаў, два запісы пошукавікі змаглі прачытаць. Такім чынам, устаноўлены два прозвішчы з даволі падрабязнай інфармацыяй. Адзін з іх — Кісараў Уладзімір Мікалаевіч, сяржант, 1918 года нараджэння, ураджэнец Яраслаўскай вобласці, Нікіцкага сельсавета, вёскі Пружына. Акрамя медальёна, захаваўся і рэмень з выразанымі на ім ініцыяламі «КВН». Другое прозвішча — Умараў Коныш, чырвонаармеец, 1920 года нараджэння, родам з Узбекскай ССР, Самаркандскай вобласці, Бішкотанскага сельсавета, вёскі Юльдус. У той час тут пражывала і яго сям'я. Цяпер — справа за тым, каб знайсці родных загінулых вайскоўцаў. Таксама будуць аналізавацца і вывучацца выразаныя і выдрапаныя ініцыялы на шэрагу асабістых рэчаў і амуніцыі.

ЖУДАСНЫ ВОДГУК ВАЙНЫ

Пад Слонімам ішлі жорсткія баі. Водгукі іх чуваць і цяпер. Прычым у прамым сэнсе гэтага слова. Нядаўна сапёрамі былі знішчаны неўзарваныя нямецкая авіябомба і мінамётная міна. На іх пошукавікі натрапілі каля шашы Слонім — Зэльва падчас правядзення работ. Удзельнікі Вахты Памяці дапамаглі таксама лакалізаваць месца падрыву танка Т-34, рэшткі якога раскапалі каля трасы будаўнікі-дарожнікі.

Па гэтай дарозе за чатыры гады ўдзельнікі Вахты Памяці знайшлі і ўскрылі пяць ям з астанкамі байцоў і камандзіраў, а таксама членаў іх сем'яў і простых бежанцаў. Усе тыя лакацыі, што былі вызначаны па нямецкіх фотаздымках, неслі ў сабе жудасны водгук вайны. Сёлета было вырашана шукаць яшчэ адно месца ў гэтым раёне.

— Летась да нас трапіў яшчэ адзін нямецкі здымак гэтага поля, на якім было відаць яшчэ адно месца пахавання нашых загінулых воінаў, аб чым мы нават не падазравалі, — з горыччу канстатуе Аляксандр Дударонак. — Дапамагла адна дэталь. Гэта былі фрагмент каскі і тыльнік ад вінтоўкі, якія знайшоў на полі ўдзельнік экспедыцыі. І тут мы ўспомнілі, што ў нас ёсць здымак, дзе на ўваткнутую ў зямлю вінтоўку надзета каска. Аказалася, што мы амаль што побач з гэтым месцам расклалі фотаздымкі, а сама лакацыя знаходзіцца там, дзе мы паклалі свае рэчы і заплечнікі. Мы хутка расчысцілі гэта месца і пачалі шукаць сігнал. Затым пусцілі экскаватар. Калі зразумелі, што там нешта ёсць, пачалі працаваць уручную. Там мы знайшлі астанкі дзевяці байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі і два смяротныя медальёны. Але мы не атрымалі ніякай інфармацыі — адзін быў расколаты, а другі спарахнеў. Так і засталіся яны невядомымі салдатамі той вайны.

Кіраўнік пошукавай групы заўважыў, што хутчэй за ўсё там былі пахаваны савецкія вайскоўцы, абпаленыя целы якіх каля абгарэлай тэхнікі сфатаграфавалі нямецкія салдаты. Фотаздымкі дайшлі да пошукавікаў ва ўсёй жорсткай праўдзе тых падзей. А сёлета, больш чым праз 80 гадоў, былі знойдзены астанкі байцоў. Іх чакае годнае перапахаванне.

«ПЕРАДАЙЦЕ МЕДАЛЬЁН МАЦІ — Я АДЗІН У ЯЕ»

— Мы заўсёды бываем асабліва ўзрушаны, калі ўдаецца вызначыць прозвішча нашых байцоў, — расказвае Аляксандр Дударонак. — Знойдзеныя медальёны адкрываем з замiраннем сэрца. Не заўсёды нашы надзеі апраўдваюцца, бывае, што капсула пашкоджана альбо папера рассыпаецца, але некаторыя надпісы ўдаецца аднавіць. Для нас гэта вельмі істотна.

Так здарылася сёлета падчас раскопак у Свіслацкім раёне, дзе дзякуючы медальёну ўдалося ўстанавіць даныя аднаго з байцоў. Гэта Сяргееў Аляксандр Міхайлавіч, чырвонаармеец, 1921 года нараджэння, ураджэнец Ленінграда, мабілізаваны Кастрычніцкім РВК. Пазначана таксама Ганна Аляксандраўна Сяргеева, але хто яна, канкрэтна не ўказана. У другім месцы разам з астанкамі байцоў і камандзіраў, якія загінулі на тэрыторыі раёна, былі знойдзены тры медальёны і кубак з выдрапаным на ім надпісам «Тапалеўскі, 1941 год». Устаноўлена, што поўнае імя гаспадара кубка — Пётр Іванавіч Тапалеўскі, 1919 года нараджэння, ён ураджэнец сяла Грыгор'еўка, цяпер Херсонскай вобласці. Загінуў у чэрвені 1941 года. Родных загінулых байцоў будуць шукаць валанцёры і самі ўдзельнікі экспедыцыі.

Разам з астанкамі шасці чалавек пад вёскай Азярніца Слонімскага раёна знойдзены добра захаваны ўкладыш, які належаў Рудаманаву Ілыі Васільевічу, 1920 года нараджэння, ураджэнцу Пяцігорска, Гарачаводскага сельсавета, калгаса «Чырвоны Партызан». Удалося знайсці медальён з укладышам на імя Атажанава Пірмата, чырвонаармейца 1915 года нараджэння з Джалалабадскай вобласці Кіргізіі. Іх імёны таксама будуць увекавечаны для нашчадкаў.

Дарэчы, з раскопкамі пад Азярніцай звязана адна вельмі шчымлівая гісторыя. У яме на 11 чалавек у аднаго з байцоў знайшлі зацiснуты ў кулаку смяротны медальён. Аляксандр Дударонак адразу ўспомніў колішні расказ мясцовай жыхаркі Антаніны Ефімовіч, якая на пачатку вайны пасля пажару на хутары разам з іншымі жыхарамі пайшла ў Азярніцу. Немцы прынялі іх за бежанцаў і сем'і камандзіраў і пагналі расстрэльваць да царквы. Яны ўжо стаялі паабапал той ямы, калі настаяцель храма сказаў нямецкаму афіцэру, што гэта мясцовыя жыхары. Па словах жанчыны, іх тады адпусцілі. Але яна была сведкай, як да ямы немцы неслі цяжка параненага маладога байца. Ён працягваў да жыхароў руку, у якой трымаў смяротны медальён, і прасіў, каб перадалі яго маці, бо ён у яе адзіны сын. Немец, які стаяў побач, стукнуў байца прыкладам і жывога кінуў у яму. На жаль, укладыш з таго зацiснутага ў руцэ медальёна не захаваўся.

Пахаванне савецкіх ваеннаслужачых у сучасным Слонімскім раёне (нямецкі архіўны фотаздымак).

За некалькі метраў ад той ямы знайшлі яшчэ адзін магільнік, пераважна з астанкамі грамадзянскіх асоб і двух ваеннаслужачых. На краю ямы знаходзіліся рэшткі камандзірскіх скураных ботаў, брытва і некалькі скручаных салдацкіх рамянёў. Відаць, перад расстрэлам ахвярам загадалі скласці рэчы асобна.

— Мы планавалі абследаваць чатыры лакацыі, якія зафіксаваны на нямецкіх фотаздымках, адпрацавалі дзве з іх — і там быў вынік, — робіць выснову кіраўнік пошукавай групы «Бацькаўшчына». — Думаю, што вернемся туды ў наступным годзе. Мой дзед неяк казаў, што каля царквы была яшчэ яма на 40 чалавек. Магчыма, знойдзем і новыя, невядомыя месцы пахавання расстраляных каля царквы ваеннапалонных і бежанцаў.

УВЕКАВЕЧЫЦЬ ПАМЯЦЬ АБАРОНЦАЎ АЙЧЫНЫ

Чарговы этап акцыі «Беларусь памятае: эстафета Памяці» праходзіў на Гродзеншчыне з 30 ліпеня да 7 жніўня і быў прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На тэрыторыі Свіслацкага і Зэльвенскага раёнаў выяўлена па два новых месцы пахавання, у Слонімскім — чатыры. Усяго з ям-магіл эксгумавана 70 астанкаў, якія перададзены мясцовым органам улады для далейшага перапахавання. Мяркуецца, што такое мерапрыемства пройдзе ў кожным з раёнаў у верасні і будзе прымеркавана да Дня народнага адзінства.

Аб тым, як сёлета вядзецца пошук у цэлым па краіне, расказаў намеснік камандзіра 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Аляксандр Крэмянеўскі. Ён паведаміў, што на 2024 год запланавана адпрацаваць 123 аб'екты. Яшчэ 35 уключана дадаткова па хадайніцтве Генеральнай пракуратуры, мясцовых органаў улады, а таксама па зваротах грамадзян. Работы праводзяцца з канца сакавіка сіламі шасці спецыялізаваных пошукавых падраздзяленняў на тэрыторыі Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай і Мінскай абласцей.

На дадзены перыяд па факце генацыду адпрацавана 14 аб'ектаў. Устаноўлена 13 невядомых да гэтага часу месцаў пахавання, эксгумаваны астанкі 842 мірных жыхароў. Пошук воінскіх пахаванняў запланаваны на 133 аб'ектах. Разам з асабовым складам 52-га пошукавага батальёна ў акцыі прымаюць удзел 13 рэгіянальных грамадскіх арганізацый, пошукавыя клубы і атрады Беларусі, Расіі і Казахстана.

На цяперашні момант пошукавыя работы поўнасцю завершаны на 102 аб'ектах. Знойдзены 462 вайскоўцы, якія загінулі ў перыяд з 1941 да 1944 года. 17 імёнаў удалося ўстанавіць. І гэта, бадай, галоўная місія пошукавай справы.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота з архіва 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна і пошукавай групы «Бацькаўшчына».

«МНЕ ПАДАБАЕЦЦА ДАПАМАГАЦЬ ЛЮДЗЯМ...»

Малады спецыяліст пра першае працоўнае месца, цікавасць да прафесіі і тое, што агульнага паміж медыцынай і музыкай

Жыццё Аліны Андрушынай нядаўна кардынальна памянялася. Учарашняя студэнтка Віцебскага медыцынскага ўніверсітэта з 1 жніўня займае пасаду ўрача-неўролага Быхаўскай ЦРБ. Наперадзе — два гады адпрацоўкі, і гэта вельмі добрая школа для атрымання вопыту для маладога спецыяліста.

Аліна — дзяўчына сур'ёзная і мэтанакіраваная. З прафесіяй вызначылася яшчэ ў школе. Медыкаў у яе сям'і няма, але ёй вельмі падабаліся хімія і біялогія. Калі атрымала атэстат, яшчэ вагалася паміж біяфакам БДУ і медыцынскім ВНУ. Але, калі ўсё ўзважыла і абдумала, вырашыла, што выкладчыцай быць добра, але ўсё ж такі ўрачом лепш. Падчас вучобы былі моманты, калі прыходзілі думкі: «А што, калі памылілася з выбарам?» Прафесія не для слабанервовых, трэба быць рашучым, адказным і ўмець трымаць сябе ў руках. Выгляд крыві яе не пужаў, але калі па вучобе прысутнічала на ўскрыцці, было крыху не па сабе. Потым супакоілася: не патолагаанатамам жа збіраецца працаваць, а значыць, і перажываць не трэба. На апошнім курсе канчаткова вызначылася з будучым профілем — неўралогія. Быхаў выбірала асэнсавана: ад яго зусім блізка да роднага Магілёва. А ў Магілёве — бацькі, малодшая сястра, сябры, трэнажорная зала, нарэшце, куды Аліна ходзіць, каб трымаць тонус.

— Мне цікава пачынаць сваю працоўную дзейнасць менавіта ў Быхаўскай раённай бальніцы, — кажа яна. — Праз яе прайшло шмат вядомых магілёўскіх медыкаў, якія займаюць сёння кіруючыя пасады. Некаторых з іх я ведаю асабіста і хачу стаць такім жа прафесіяналам, як і яны. Разумею, што для гэтага трэба пастаянна вучыцца, таму шмат вольнага часу аддаю вывучэнню спецыяльнай літаратуры.

Падчас праходжання інтэрнатуры ў Магілёўскай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі паспела захапіцца складанымі медыцынскімі выпадкамі.

— Гэта чараўніцтва, калі на вачах чалавек, які літаральна паміраў, вяртаецца да жыцця, — кажа Аліна. — Медыкі прымяняюць у сваёй рабоце перадавыя прыёмы лячэння. Той жа тромбалізіс, які дапамагае пацыенту хутка акрыяць ад інсульту і стаць на ногі. Шмат чаго для сябе адкрыла, шмат чаму навучылася ў магілёўскіх урачоў. Яны вельмі дасведчаныя. Нават не магу кагосьці аднаго выдзеліць — усе цудоўныя. Дзякуючы ім, мне спадабалася аказваць экстранную дапамогу, працаваць са складанымі пацыентамі. Уразіла, якая сучасная і тэхналагічная ў Магілёве бальніца, там сапраўды атрымліваеш неверагоднае задавальненне ад сваёй дзейнасці.

У Быхаве малады ўрач працуе на прыёме пацыентаў. Расказвае, што вядзе яго з 8 гадзін раніцы да 16.00. Людзей звяртаецца шмат. Яно і не дзіўна: сёння хваробы неўралагічнага паходжання адны з самых распаўсюджаных. Перапынак на абед невялікі, расслабляцца няма калі. Закінуў бутэрброд у рот, запіў кавай — і зноў вяртаешся да пацыентаў.

— Сёння шмат хто скардзіцца на болі ў спіне, — ацэньвае стан здароўя быхаўчан урач. — І тут важна паставіць правільны дыягназ. Ацаніць, дзе боль лакалізаваны. Гэта мышачны спазм ці нешта больш сур'ёзнае.

На прыём прыходзяць у асноўным людзі сталыя і сярэдняга ўзросту. Любяць спытацца, ці надоўга да іх маладая ўрач прыехала. Час пакажа. Пакуль яна і горад толкам не бачыла. У першыя дні работы з непрывычкі нават не паспявала ўкласціся ў часовыя рамкі, крыху затрымлівалася пасля работы. Трэба было ва ўсё ўнікнуць, разабрацца, плюс картачку запоўніць, рэцэпт выпісаць. Але ўжо прызвычаілася. Тым больш што спяшацца ёсць куды — ключы ад арэнднай кватэры ў доме непадалёк ад бальніцы яна атрымала за некалькі дзён да пачатку работы. Двухпакаёўку з вялікімі прасторнымі пакоямі, дзе літаральна перад заездам жыльцоў быў зроблены рамонт, яна дзеліць са сваёй калегай з Гомеля. Лічыць, што такое вырашэнне кватэрнага пытання вялікі плюс для маладога спецыяліста, і ўдзячна дзяржаве, якая праяўляе клопат пра такіх, як яна.

Цяпер дзяўчына абжываецца на новым месцы, бацькі дапамагаюць наводзіць утульнасць. Трэба было набыць мэблю, з густам яе расставіць. Аліна прыхільніца мінімалізму і прастаты ў абыходжанні: адмовілася ад грувасткай шафы і аддала перавагу адкрытым скрыначкам і палічкам. Айчым замацаваў іх там, дзе трэба. Атрымалася ўтульна і ўсё на віду — нічога не трэба шукаць.

Паглядзець, як маладая ўрач уладкавалася на новым месцы пражывання, ужо прыходзіла з бальніцы спецыяліст па кадрах. Цікавілася, ці ўсё задавальняе, чаго не хапае. Галоўны ўрач бальніцы Таццяна Саніна нагогул апякае маладых супрацоўнікаў. Аліна адразу ж звярнула ўвагу, што іх шмат у калектыве. Сёлета ў гэтую ж бальніцу, акрамя яе, размеркаваліся яшчэ чатыры дактары. Спадабалася,

❍ У тэму

Галоўны ўрач Быхаўскай ЦРБ Таццяна САНІНА:

— Сёлета наш калектыў папоўніўся пяццю ўрачамі: неўролагам, афтальмолагам, анестэзіёлагам, хірургам, урачом агульнай практыкі. На сёння па ўрачах — вузкіх спецыялістах у нас пытанне закрыта. Вельмі рада, калі прыходзяць маладыя супрацоўнікі. Яны ініцыятыўныя, актыўныя, у іх запал у вачах, імкненне працаваць. Пра іх работу ад жыхароў ужо паступаюць станоўчыя водгукі. Кажуць, што ветлівыя, культурныя, уважлівыя. За ўсімі маладымі спецыялістамі замацаваны настаўнікі. Літаральна днямі мы збіралі іх, каб пазнаёміць паміж сабой, з настаўнікамі, калектывам, расказаць пра тое, хто за што адказвае, агучылі пытанні па зарплаце, жыллі, магчымасцях нашага прафсаюза. Больш маштабнае ўшанаванне маладых спецыялістаў у нас звычайна праходзіць у верасні, пасля таго, як яны крыху папрацуюць на новым месцы. Першае працоўнае месца — гэта заўсёды каласальны вопыт, разуменне, як дзейнічае сістэма аховы здароўя, пачынаючы з раённага ўзроўню. Нават калі яны потым і не застаюцца ў раёне, усё роўна яны больш дасведчаныя, чым іх калегі, якія пачынаюць у буйных гарадскіх медустановах. Бо ў іх будзе разуменне, як працуе сістэма пярвічнага звяна, якая аблугоўвае сельскага пацыента. Плюс яшчэ ў тым, што ў раённай бальніцы хутчэй можна зрабіць кар'еру. Тут хутчэй заўважаць лідарскія, арганізатарскія здольнасці. Я сама калісьці пачынала тут у якасці ўчастковага тэрапеўта. Сёння бальніца паляпшае сваю матэрыяльна-тэхнічную базу, праводзіцца капітальны рамонт двух асноўных лячэбных будынкаў. Купляецца новае абсталяванне, робіцца ўсё для таго, каб пацыенты не былі ні ў чым пакрыўджаны, а ў маладых спецыялістаў было жаданне застацца.

Вітаем, маладое папаўненне!

ПРАЦАВАЦЬ І ЖЫЦЬ КАМФОРТНА

Сёння ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі краіны задзейнічана 231 тысяча кіруючых супрацоўнікаў і спецыялістаў.

— Для параўнання, у 1990—1994 гадах мы атрымлівалі прадукцыі ў два разы менш, чым сёння. А працавалі ў той час у сельскай гаспадарцы 1 млн 90 тысяч работнікаў, — кажа **начальнік галоўнага ўпраўлення адукацыі, навукі і кадравай палітыкі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь Уладзімір САМСАНОВІЧ.** — Гэта сведчыць аб тым, што тэхналагічныя працэсы, распрацаваныя вучонымі, укаранёны ў сельскагаспадарчую вытворчасць. Ні адна навуковая распрацоўка не можа рэалізавацца самастойна, для гэтага патрэбны спецыялісты. І 90 працэнтаў моладзі, што сёння выпускаецца з аграрных устаноў адукацыі, занята менавіта ў сельскай гаспадарцы.

Адсылаючы свае наступныя словы перш за ўсё да моладзі, Уладзімір Самсановіч падкрэсліў, што работнікі АПК краіны заслугоўваюць усяго, што мы называем дастойным: умоў працы і побыту, заработнай платы, усяго неабходнага для паўнацэннага жыцця ў вёсцы.

— Кіраўніком дзяржавы ставіцца задача зрабіць усё, каб жыццё ў вёсцы было багацейшым, больш прыгожым, цікавым, каб маладыя людзі маглі рэалізаваць свае планы і намеры на зямлі, — сказаў прадстаўнік Мінсельгасхарча. — Таму дзяржава працуе над павышэннем прэстыжнасці пражывання ў сельскай мясцовасці: будуюцца новыя дамы гарадскога тыпу, школы, амбулаторыі, дзіцячыя садкі, крамы, аддзяленні сувязі, банкі і іншае. Набірае тэмпы праект «Вёска будучыні». Ужо сёння на карце Беларусі ёсць з дзясятак адрасоў, дзе ён здзейсніўся.

Мадэрнізацыя, новыя тэхналогіі як на вытворчасці, так і ў побыце — усё гэта робіцца не для птушачкі. А дзеля таго, каб маладыя і перспектыўныя маладыя спецыялісты выбралі месцам свайго жыцця і прафесійнага росту сельскую мясцовасць. Але аднаго жадання, каб так і было, мала.

— Сёння кожны кіраўнік павінен усвядоміць, што своечасовы падбор, правільная расстаноўка спецыялістаў, рацыянальнае выкарыстанне кадравага патэнцыялу, стварэнне ўмоў для замацавання кадраў — гэта яго доля, — адзначыў Уладзімір Самсановіч.

І дадаў, што жаданага ўзроўню замацоўвання моладзі ў арганізацыях АПК дасягнуць пакуль не ўдаецца. Але ёсць рух наперад, а значыць, ёсць і далягляды. Паводле яго слоў, сёння дзейнічае каля 17 нарматыўных прававых актаў, накіраваных на замацаванне маладых спецыялістаў у сельскагаспадарчых арганізацыях. Гэта і льготы, і забеспячэнне жыллём, і даплаты, а таксама тарыфныя пагадненні паміж Міністэрствам сельскай гаспадаркі, прафсаюзамі і Беларускім аграпрамысловым саюзам. Студэнтам вышэйшых аграрных устаноў адукацыі па іх жаданні з 2021 года даецца магчымасць у перыяд навучання ў ВНУ (на канікулах) прайсці воінскую службу ў рэзерве, што вызваляе іх ад тэрміновай службы. На сёння такую службу праходзяць 179 студэнтаў, 50 яе скончылі.

СА ШКОЛЬНАЙ ЛАВЫ

Практыка паказвае, што найбольш паспяхова ў сельскагаспадарчых арганізацыях асвойваюцца маладыя спецыялісты — выхадцы з сельскай мясцовасці. І гэта зразумела: яны адаптаваны да вясковых умоў жыцця ў вёсцы і будучую спецыяльнасць выбіраюць свядома. Але ёсць і іншыя варыянты прывіць моладзі яшчэ са школьнай лавы цікавасць да розных сфер сельскай гаспадаркі.

— З 2018 года ў Беларусі функцыянуюць класы аграрнай накіраванасці, — дзеліцца Уладзімір Самсановіч. — Іх вучні па праграме факультатыўных заняткаў «Уводзіны ў аграрныя прафесіі» ў 10-11 класах вывучаюць свет сельскагаспадарчых раслін і жывёл, асновы аграрнай вытворчасці і тэхналогіі атрымання прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі, тэхнічнае і энергетычнае забеспячэнне сельскагаспадарчай галіны. — Гэта добрая магчымасць вызначыцца з выбарам будучай прафесіі, а гаспадаркам — адабраць прафесійна арыентаваных абітурыентаў, якія паступяць на профільныя спецыяльнасці ў аграрныя ВНУ на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі.

КАЛЕДЖ — УДАЛЫ СТАРТ

Падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасцях сярэдняй спецыяльнай адукацыі для галіны сельскай гаспадаркі ў 2024 годзе ў краіне ажыццяўляюць 37 устаноў адукацыі па 12 спецыяльнасцях. Набор складае каля 4 тысяч чалавек. Амаль у два разы больш такіх устаноў на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі — падрыхтоўка рабочых кадраў для арганізацый сельскай гаспадаркі ажыццяўляецца па 5 спецыяльнасцях і 14 кваліфікацыях у 64 каледжах. Штогадовы набор — каля 3 тысяч чалавек.

— Сістэма ПТА і ССА інтэгравана ў адзіны ад установы адукацыі — каледж, — расказвае **начальнік упраўлення прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Аляксандра ПЯТРОВА.** — Сёння ў нас тры віды каледжаў. Сярод іх ёсць тыя, якія рэалізоўваюць праграмы толькі сярэдняй спецыяльнай адукацыі, пэўная частка — толькі праграмы прафесійна-тэхнічнай. А таксама каледжы, якія рэалізоўваюць праграмы і ПТА, і ССА. Усяго — 293 установы.

Прадстаўнік адукацыйнага ведамства расказала аб тым, што ва ўсіх каледжах, акрамя асноўнай дзейнасці, рэалізоўваюцца адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых, якія займаюцца прафесійнай падрыхтоўкай і перападрыхтоўкай, павышэннем кваліфікацыі рабочых і служачых, у тым ліку і для сістэмы АПК.

Аляксандра Пятрова таксама адзначыла, што ў Беларусі паспяхова функцыянуюць 52 цэнтры кампетэнцый у сістэме сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якія аснашчаны найноўшым абсталяваннем і прызначаны забяспечыць асваенне перадавых метадаў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

што калектыў дружны, адкрыты. І параіцца ёсць з кім, ёсць настаўнік, за якім яна замацавана, урач-неўролаг Кацярына Кілеса. Калі нешта незразумела — і падкажа, і дапаможа. Ды і магілёўскія калегі, з якімі пазнаёмілася ў інтэрнатуры, заўсёды гатовы падставіць плячо. Прафесійная этыка, як той казаў, працуе.

За кароткі час сваёй работы ў Быхаўскай ЦРБ суразмоўніца паспела пабываць на раённым маладзёжным турзлёце, у якім брала ўдзел бальніца. Там атрымалася прадэманстраваць свае творчыя таленты — Аліна добра іграе на гітары.

— У школе паралельна чатыры гады вучылася ў «музыкалцы» ігры на піяніна, — усміхаецца дзяўчына. — Вельмі падабаўся мне гэты інструмент. Але не хапала часу займацца. Затое гітару ўжо сама асвоіла. Добры спосаб пераключыцца і ўзняць настрой сабе і іншым.

Фінансавым складнікам у сваёй рабоце маладая спецыяліст таксама не пакрыўджана. Хаця першай зарплаты яшчэ не было, яле яна ўжо ведае, колькі прыблізна атрымае на рукі. Кажа, што для пачаткоўца гэта даволі годная сума. А хутка яшчэ і пад'ёмныя выплацяць.

Вось толькі пасля вялікага горада цяжка прыстасавацца да запаволенага рытму жыцця раённага цэнтра. Сеткавікі ў горадзе ўжо ёсць, а вось з сучаснымі месцамі адпачынку — напружанне. Схадзіць вечарам з сябрамі асабліва няма куды.

— Пакуль для мяне Быхаў — гэта перш-наперш работа, — кажа Аліна. — Мне падабаецца маё рабочае месца, людзі, з якімі займаюся любімай справай. Гэта добры вопыт і цудоўны старт. Але хочацца развівацца. Мне падабаецца экстранная дапамога, складаныя пацыенты. Хачу цалкам рэалізавацца ў гэтай дзейнасці і прыносіць карысць грамадству.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Аліны АНДРУШЫНАЙ.

Да новых вяршынь — з новым настаўнікам

Сёлета ва ўстановы сярэдняй адукацыі і дзіцячыя сады Полаччыны прыйшлі каля 60 маладых спецыялістаў. У кожнага — свае вялікія планы на першыя крокі ў педагагічнай прафесіі. Настаўніца пачатковых класаў сярэдняй школы № 18 імя Ефрасінні Полацкай горада Полацка Марыя НАСАТОВІЧ, нягледзячы на юны ўзрост, ужо абрала для сябе педагагічны стыль — патрабавальны і строгі.

18-гадовая Марыя Сяргееўна родам з Полаччыны. Прымаўка «дзе нарадзіўся — там і згадзіўся» спрацавала не толькі для яе, але і для старэйшай сястры. У сям'і Насатовічаў увогуле склалася невялікая дынастыя педагогаў: адна бабуля ў свой час выкладала фізічную культуру і здароўе, другая вучыла дзяцей рускай мове і літаратуры. Марыя і яе старэйшая сястра Яна прадстаўляюць пакуль другое пакаленне настаўнікаў — Яна ў гэтай галіне працуе ўжо чацвёрты год, а наша гераіня толькі прыйшла на першае рабочае месца.

Дзяўчына скончыла педагагічны каледж ВДУ імя П. А. Машэрава. Выбіраючы будучую прафесію, была ўпэўнена, што стане настаўнікам. Па-іншаму, напэўна, у такой сям'і і быць не магло. «Вельмі люблю дзяцей, у мяне шмат сясцёр і братоў, я ўвесь час праводзіла з імі. Спадзяюся, што ў школе ўсё будзе добра і я не расчарую дзяцей. Каледж даў мне добрую падрыхтоўку: было шмат практыкі, гутарылі з настаўнікамі, якія яе праводзілі. Яны ж і ацэньвалі нас. Я ўпэўнена, што ўсё атрымаецца. Наогул, прыступаю з вельмі пазітыўным настроем, але хвалююча вельмі. Чакаю з нецярпеннем Дня ведаў, каб убачыць дзяцей», — расказала Марыя Насатовіч. Дыплом дзяўчыны дазваляе выкладаць рускую мову і літаратуру ў старшых класах, аднак душа нашай гераіні больш ляжыць да маленькіх, таму і пайшла ў пачатковыя класы.

За амаль тры гады ў каледжы Марыя атрымала педагагічныя веды не толькі ў тэорыі. Выбіраючы месца пераддыпломнай практыкі, звярнула ўвагу на СШ № 18 — буйную, прыгожую, з дасканаламі сучаснай інфраструктурай і вялікай колькасцю навучэнцаў. Сюды ж малады педагог прыйшла на размеркаванне і плануе застацца ва ўстанове адукацыі пасля абавязковых двух гадоў. Дарэчы, на першым званку Марыя будзе сустракаць 28 дзетак, якія пойдуць у чацвёрты клас. «Не страшна. Галоўнае — зразумець, хто ёсць хто, і наладзіць у калектыве атмасферу адзінства. Важна заўважыць задаткі талентаў вучняў і дапамагчы іх развіць. Але, нягледзячы на мой юны ўзрост, быць дзецям сяброўкай і дазваляць пераходзіць граніцы я не буду. Школьнікі павінны разумець, што да настаўніка трэба ставіцца з павагай», — разважае дзяўчына.

У мінулым годзе ў 18-ю школу прыйшлі сем маладых спецыялістаў, сёлета — тры. Установа адукацыі цалкам укамплектавана настаўніцкімі кадрамі. За кожным маладым спецыялістам тут на працягу двух і больш гадоў усталёўваецца настаўніцтва — за імі замацоўваюць спецыялістаў з першай і вышэйшай катэгорыямі. Па словах **дырэктара школы Канстанціна ШУХЛЕВА**, кожнаму маладому спецыялісту ўстанаўліваецца надбаўка за кантрактную форму найму. «Мы падтрымліваем нашых маладых спецыялістаў яшчэ і тым, што пры наяўнасці такой магчымасці яны пішуць заяву на выдзяленне арэнднага жылля. Два спецыялісты нашай школы яго ўжо атрымалі», — распавёў дырэктар.

«Сёлета сямі маладым спецыялістам першага года працы па вышэйшай чвэрці (гэта магістранты і тыя, хто з чырвоным дыпломам скончыў навучальныя ўстановы) мы прысвоілі другую кваліфікацыйную катэгорыю, што дало ім магчымасць мець большы заробак, адпаведна, надбавачную прэміяльную частку», — дадаў Канстанцін Шухлеў. Ён падкрэсліў, што асобна для маладых спецыялістаў на кожных канікулах у школе праводзяць заняткі, каб тым лягчэй было ўнікаць у працэс, працаваць з дакументамі і рыхтавацца да ўрокаў.

Афіцыйна Марыя Насатовіч прыступіла да працы зусім нядаўна, 15 жніўня. Даволі вялікі калектыў — 146 педагогаў — сустрэў добразычліва. У хуткім часе да дзяўчыны прымацуюць вопытнага педагога-куратара, які будзе дапамагаць ва ўсіх незразумелых момантах. Падрыхтоўцы будучых кадраў у школе ўдзяляюць вялікую ўвагу, цесна супрацоўнічаюць з ВНУ. «Гэта і наш Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ефрасінні Полацкай. Ганарымся тым, што кожны год (і гэты не выключэнне) 50 % нашых выпускнікоў паступаюць у ПДУ на разнастайныя спецыяльнасці. Таксама супрацоўнічаем з галаўным абласным ВНУ — Віцебскім дзяржаўным універсітэтам імя П. М. Машэрава, дзе таксама заказваем кадры. Калі ўстанова адукацыі бачыць навучэнца, які гарыць жаданнем, дапамагаем яму знайсці сваё прызванне. У тым ліку і шляхам мэтавых накіраванняў», — адзначылі ў адміністрацыі школы.

На педагогіку ў гераіні даволі вялікія планы, Марыя ўжо паступіла ў ВДУ на завочнае аддзяленне. Цяпер прыйдзецца сумяшчаць несумяшчальнае, бо ні для каго не сакрэт, што працоўны дзень настаўніка не заканчваецца разам з урокамі. Але, расказвае Марыя Насатовіч, маладосць і азарт дазваляюць паспяваць усюды. Радуе дзяўчыну і тое, што тут, у васямнаццатай школе, ёй сваё плячо падставіць родная сястра Яна, якая мае ўжо грунтоўны вопыт. А пакуль Марыя маральна і фізічна рыхтуецца да новага навучальнага года, набывае неабходную літаратуру і метадычныя дапаможнікі і, вядома, з нецярпеннем чакае першы званок.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота з архіва гераіні.

Фота БелТА.

работы для ўсіх профільных спецыяльнасцяў краіны, восем з іх — у сельскагаспадарчай галіне.

АРЫЕНЦІР НА ПРАКТЫКУ

Назва Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта гаворыць сама за сябе, там рыхтуюць тэхнароў для сельскай гаспадаркі па ўсіх кірунках: інжынераў, інжынераў-механікаў, спецыялістаў тэхнічнага профілю па тэхнічным сэрвісе, энергетыцы, цеплатэхніцы, аўтаматызацыі, ахове працы — гэта значыць, увесь цыкл інжынернай службы, які неабходны для сельскай гаспадаркі.

На думку **рэктара БДАТУ Мікалая РАМАНЮКА**, нішто так не дапамагае падрыхтаваць сапраўды дасведчанага спецыяліста, як магутная і сучасная матэрыяльна-тэхнічная база, якую ўніверсітэт і мае. Месцазнаходжанне ВНУ — у сталіцы краіны, дзе дыслакуецца галоўны навуковы цэнтр — Нацыянальная акадэмія навук. Гэта дазваляе надаваць адукацыі інавацыйны характар, прыцягваць да навучальнага працэсу тытулаваных вучоных, а таксама праводзіць заняткі ў навукова-практычных цэнтрах і навукова-даследчых інстытутах.

І яшчэ адна перавага, якая іграе на будучыню выпускнікоў — практыкаарыентаванасць.

— Ва ўніверсітэце толькі 25 працэнтаў лекцыйных заняткаў. А больш за 50 % выкладчыкаў у нас маюць вытворчы стаж, — распавядае рэктар. — Мы практыкуем трохэтапную падрыхтоўку студэнтаў. На першым курсе даём ім рабочую прафесію слесара па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, на другім і трэцім яны атрымліваюць прафесію трактарыста-машыніста трох катэгорый, у тым ліку самаходных машын і збожжаўборачных камбайнаў. Ну, і, нарэшце, атрымліваюць пасведчанне кіроўцы транспартных сродкаў катэгорыі «В».

Сёння кіраўнік дзяржавы паставіў задачу больш актыўна выкарыстоўваць дроны ў сельскай гаспадарцы.

— Мы працуем над гэтым не першы год. Цяпер на базе нашага інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў прайшла навучанне група спецыялістаў — аператараў па кіраванні БПЛА. Думаю, што ў перспектыве БДАТУ будзе даваць студэнтам універсітэта альбо працоўную прафесію, альбо пасведчанне аператара па кіраванні беспілотнікамі.

СУВЯЗЬ НЕ ГУБЛЯЕМ

Падрыхтоўка спецыялістаў практычна па ўсіх спецыяльнасцях, якія запатрабаваны ў сельскай гаспадарцы, акрамя ветэрынарнай медыцыны, — такі профіль найстарэйшай аграрнай установы адукацыі — Беларускай дзяржаўнай ордэнаў Кастрычніцкай рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчай акадэміі.

Па словах **рэктара акадэміі Віталя ВЕЛІКАНАВА**, з першага курса арыентаваныя на практыку, інавацыйную і навуковую дзейнасць студэнты гэтай ВНУ аўтаматам атрымліваюць і запатрабаванасць, і паспяховую прафесійную кар'еру пасля заканчэння акадэміі. Гэтаму ж садзейнічае і цесная работа з базавымі прадпрыемствамі, на якіх арганізавана 60 філіялаў установы адукацыі і дзе на рэгулярнай аснове праходзяць навучанне студэнты БДСГА.

Тут 62 працэнты выкладчыкаў маюць вучоныя ступені. У акадэміі працуе тэхнапарк «Горкі», інавацыйная структура, якая ўкараняе ў навучальны працэс элементы дакладнага земляробства і не толькі. Студэнты маюць магчымасць займацца навуковай працай. І паспяхова гэта робяць: імі выдадзена больш за 1800 навуковых артыкулаў.

— Мы ганарымся сваімі студэнтамі. Але самае галоўнае — калі выпускаем за сцены акадэміі, іх не кідаем, — распавядае Віталь Веліканаў. — У нас распрацавана сістэма суправаджэння маладога спецыяліста на вытворчасці. Мы яго курыруем не толькі два гады (калі студэнт вучыўся на агульных падставах), але і наступныя два-тры гады. Калі падрыхтоўка была мэтавая, то пяць і больш гадоў. Для гэтага замацоўваем настаўнікаў з ліку былых кураторараў выпускнікоў ці кіраўнікоў дыпломных работ. Яны маюць пастаянную сувязь з маладымі спецыялістамі, сочаць за іх работай, прасоўваннем. На кафедрах факультэтаў вядуцца кнігі ўліку, дзе фіксуюцца звароты нашай моладзі па самых розных пытаннях, у тым ліку і сацыяльна-бытавых. Выкладчыкі звяртаюцца ў органы мясцовай улады, і ўсе пытанні вырашаюцца.

І ўсё ж, на думку рэктара сельскагаспадарчай акадэміі, важная, калі не ключавая, роля ў замацаванні кадраў адведзена найменьшікам. Менавіта яны ў першую чаргу павінны быць зацікаўлены ў тым, каб утрымаць спецыялістаў, стварыць спрыяльныя ўмовы для іх працы і адпачынку, забяспечыць дастойнай заработнай платай і добраўпарадкаваным жыллём.

Алена ВІНАГРАДАВА.

ЗБЕРАГЧЫ І ЗАХАВАЦЬ

Развешаныя на дрэвах кавалкі тканіны могуць адпудзіць птушак. Але аўтар ліста піша, што гэты спосаб у яе садзе не працуе. Заўважу, што найбольш эфектыўныя ад птушак палотны тканіны белага колеру, якія калышацца на ветры. Менавіта белы колер адпужвае крылатых зладзюжак. Можна таксама вешаць белыя стужкі ўздоўж ягадных насаджэнняў.

Яблыкі: у скрыні і пад ложак

«У гэтым годзе чакаю добры ўраджай яблыкаў са свайго саду. Як захаваць іх у хатніх умовах на максімальна доўгі тэрмін?»

Вераніка Мацкевіч,
Астравецкі раён.

— Самае галоўнае ў гэтым пытанні — зрабіць правільную ўборку ўраджаю, — адказвае **вядучы навуковы супрацоўнік РУП «Інстытут пладаводства», кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт Марыя МАКСІМЕНКА.** — Важна вызначыць аптымальныя тэрміны ўборкі пладоў і правільна зняць іх з дрэва. Існуюць розныя фазы спеласці семечкавых — яблыкаў і груш. Спачатку дасягаецца здымная спеласць — на гэтым этапе плод якраз і здымаюць для захоўвання. Праз некалькі дзён (ад двух да пяці ў залежнасці ад сорту) надыходзіць тэхнічная спеласць, па дасягненні якой плады адпраўляюцца на харчовыя прадпрыемствы для перапрацоўкі. Далей ідзе спажывецкая спеласць, у стадыі якой плод найсмачнейшы і падыходзіць менавіта для ўжывання ў ежу. І, нарэшце, апошняя стадыя спеласці пладоў — фізіялагічная. Да яе яблыкі і грушы даводзяць толькі ў гадавальніках і насенняводчых гаспадарках, каб атрымаць насенне. Нас у дадзеным выпадку цікавіць здымная спеласць. У некаторых сартоў, дарэчы, яна супадае са спажывецкай.

Каб вызначыць гэтую ступень спеласці, існуюць розныя метады. Буйныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, як і многія фермерскія гаспадаркі, выкарыстоўваюць у асноўным ёдакрухмальную пробу. Садоўнікі-аматары вызначаюць гэтую стадыю спеласці на вока, візуальна. Аб здымнай спеласці можна казаць, калі плады пачынаюць набываць характэрную афарбоўку, уласцівую для пэўнага сорту, і без намаганняў адрываецца ад галінкі. У некаторых сартоў адбываецца таксама пабурэнне насення (разразаем плод і высвятляем, ці ёсць дадзены эфект). Для працяглага захоўвання яблыкі важна зняць на гэтым этапе. Заўчасна знятыя плады не паспяваюць назапасіць дастаткова пажыўных рэчываў, дрэнна даспяваюць пры захоўванні, моцна ўвядаюць, пашкоджваюцца хваробамі. Ды і ўраджай меншы, бо плады не дасягнулі сваёй масы. Але і пазнейшыя тэрміны збору вядуць не толькі да скарачэння часу захоўвання, але і да пашкоджання пладоў фізіялагічнымі захворваннямі, што, у сваю чаргу, прывядзе да павелічэння страт пры захоўванні. Акрамя таго, здымаючы такі плод, мы можам траўміраваць пладовыя пупышкі, якія ў гэты перыяд закладваюцца на галінках, а значыць, скарачаем ураджай наступнага года.

Каб яблыкі захоўваліся максімальна доўга, трэба выконваць наступныя парады.

● Ураджай збіраем у сухое надвор'е — ні дажджу, ні расы быць не павінна. Калі прайшоў дождж, пачакайце, пакуль плады абсохнуць. Абіраць мокрыя яблыкі — няўдалае рашэнне: так сціраецца ахоўны васковы пласт, і ў далейшым, падчас захоўвання, плады загніюць.

● Здымаем яблыкі з галінак вельмі беражліва, разам з пладаножкамі. Тут важна тэхналогія: яблыкі не трэба круціць ці адрываць з намаганнем. Каб зняць плод, пальцам варта націснуць на хвосцік, як бы адшчоўкваючы яго з галінкі. Як гэта робіцца практычна, лепш паглядзець на відэа — іх дастаткова ў сетцы Інтэрнэт.

● Укладваем плады ў любую чыстую тару: кардонныя скрынкі, драўляныя або пластыкавыя скрыні. Галоўнае, каб тара была невялікай: не больш за 15—20 кг у адной скрыні. Выкладваюць семечкавыя ў два, максімум у тры пласты. Інакш немагчыма кантраляваць якасць захоўвання.

● У ідэале захоўваць яблыкі і грушы варта пры тэмпературы 2—4 градусы з плюсам, а гэта значыць — у склепе. Ва ўмовах кватэры гэта можа быць халадзільнік (ніжнія аддзяленні), калі яблыкаў ці груш няшмат. У халадзільніку семечкавыя можна захоўваць у поліэтыленавых мяшках, герметычна запячатаных, зрабіўшы некалькі адтулін зубачысткай. У гэтым выпадку ствараецца падабенства газавага асяроддзя, у якім яблыкі і грушы захоўваюць у прамысловых умовах. Ну, а калі ўраджай вялікі, а склепа ў вас няма, да маразоў яблыкі захоўваем на балконе (калі ён не сонечны і не надта цёплы), а потым — у кладоўцы, калі такая маецца, ці нават у пакоі пад ложкам. Галоўнае, каб яблыкі не знаходзіліся побач з іншай гародніна-садавінай, бо яны, з аднаго боку, убіраюць старонніх пахі, з іншага — вылучаюць этылен, які спрыяе даспяванню гародніны-садавіны. Дарэчы, вось вам лайфхак: калі вы знялі недаспелыя памідоры, пакладзіце да іх пару яблыкаў — памідоры хутчэй даспеюць.

Калі вы правільна абралі сорт, прыдатны для працяглага захоўвання (а гэта познія яблыкі), і калі ўсе ўмовы захоўвання выкананы, ваш ураджай яблыкаў можа даляжаць аж да 8 Сакавіка. А вось захаваць костачкавыя (слівы, персікі, абрыкосы) на працяглы тэрмін праблематычна. У прамысловых умовах яны захоўваюцца ад месяца да трох, у халадзільніку дома — максімум 10 дзён, і то калі гаворка ідзе аб пладах, якія валодаюць шчыльнай мякаццю. Мяккія, буйнаплодныя костачкавыя лепш з'ядаць адразу.

Кавуны: падрыхтуйце ім «мяккую пасцелю»

«У гэтым годзе ў нас у агародзе — першы ўраджай кавуноў! Пакуль у мяне толькі тры кавуновыя расліны, але ўжо ляжаць на градках тры «паласацікі», хутка пакаштуем першы. Мару аб будучым сезоне, таму хачу даведацца, як правільна захоўваць уласны ўраджай кавуноў і на які час іх можна захаваць».

А. Р., *Слуцкі раён.*

— Бахчавыя культуры паступова завaёўваюць не толькі нашы палі, але і прысядзібныя «соткі». Кавунамі сёння займаюцца многія, — кажа **доктар сельскагаспадарчых навук Мечыслаў СЦЯПУРА,** загадчык аддзела бахчавых культур РУП «Інстытут агародніцтва». — Узяць хоць бы Маларыцкі раён — там цэлыя вёскі ўжо вырошчваюць кавуны. Ёсць фермеры і проста зацікаўленыя, апантаныя людзі, якія займаюцца кавунамі ў Століне, Слуцку, Рэчыцы, нават на Віцебшчыне.

Для захавання кавуноў, якія вязуць здалёк, выкарыстоўваюцца фунгіцыды, што змагаюцца з гнілямі. Трапляючы на плод, малекула прэпарату на працягу некалькіх хвілін забівае ўвесь міцэлій. Апрацаваныя гэтым сродкам кавуны захоўваюцца па паўгода. Іх можна трэсці, не вытрымліваць тэмпературу захоўвання — гніць яны не будуць. Але такія саставы могуць быць небяспечныя для чалавека.

— У мяне часта пытаюцца, як захаваць кавуны без выкарыстання фунгіцыдаў, — кажа навуковец. — Але, на жаль, без хімічнай апрацоўкі кавун, які і дыня, захоўваюцца месяц-паўтара.

Пра што трэба памятаць пры захоўванні кавуноў?

● Захоўваць «экалагічна чыстыя кавуны» са сваёй градкі варта пры тэмпературы ад 0 да 1 градуса з плюсам, у моху, пяску, гліне. Вельмі добра зарэкамендавала сябе перакладка кавуноў для захоўвання лісцем папаратніку.

● Не варта класці кавуны на роўную цвёрдую паверхню — у месцы дотыку з ёй плод будзе падгніваць. Падрыхтуйце ім «мяккую пасцелю»: падыдуць, напрыклад, пясок або салома.

● Нельга захоўваць кавуны побач з яблыкамі: ад этылену, які выдзяляюць апошнія, лупіна кавуна зробіцца танчэйшай і мякчэйшай. Таксама памятайце, што кавуны лёгка ўбіраюць у сябе староннія пахі.

Праганяем крылатых зладзюжак

Адказ на гэты ліст нашай чытачкі, мабыць, у жніўні ўжо не такі актуальны, як месяц таму. Але зададзенае пытанне належыць да разраду «вечных», а значыць, рэкамендацыі навукоўцаў будуць важныя і наступным летам.

«З вялікім задавальненнем прачытала ў вашай газеце, як збіраюць чарэшні ў Самахвалавічах. Хацелася б, каб супрацоўнікі Інстытута пладаводства падзяліліся сакрэтам, як яны змаглі зберагчы ягады ад птушак. Ужо другі год у нашых мясцінах птушкі вельмі спрытна збіраюць вішні, чарэшні, клубніцы, парэчкі, маліны і нават агрэст раней за людзей. Не дапамагаюць развешаныя на дрэвах бутэлькі, тканіна. Птушкі харчуюцца і яблыкамі, і нават памідорамі. Што рабіць?»

Н. П. Правалінская,
в. Браздзетчына, Аршанскі раён.

— Сапраўды, птушкі могуць нанесці сур'ёзныя страты ўраджаю ягад і костачкавых, — кажа кандыдат сельскагаспадарчых навук Марыя Максіменка. — Засцерагчы свой ураджай дапаможа дробнаячэістая сетка, якую накідваюць на расліны. У гэтым выпадку шкода ад птушак мінімізуецца, а на пладанашэнні раслін «меры засцярогі» не адбіваюцца.

● Развешаныя на дрэвах кавалкі тканіны могуць адпудзіць птушак. Але аўтар ліста піша, што гэты спосаб у яе садзе не працуе. Заўважу, што найбольш эфектыўныя ад птушак палотны тканіны белага колеру, якія калышацца на ветры. Менавіта белы колер адпужвае крылатых зладзюжак. Можна таксама вешаць белыя стужкі ўздоўж ягадных насаджэнняў.

● Палохаюць птушак і блікі святла ад бліскучых прадметаў. Можна развесіць на дрэвах камп'ютарныя дыскі, а таксама лісты фальгі, нават ёлачныя гірлянды і дзіцячыя цацкі — рознакаляровыя круцёлкі і паветраныя змеі. У сонечны дзень яны будуць іскрыцца і блікаваць, і птушкі адпраўляцца шукаць харчаванне ў іншым месцы. Але важна памятаць, што любыя метады барацьбы з птушкамі эфектыўныя толькі напачатку, адносна нядоўгі час. Потым зладзюжкі зразумеюць, што рэальнай небяспекі для іх няма, і перастануць зважаць на вашы хітрыкі.

● Адпужвальнікі птушак сёння прадаюцца і ў інтэрнэце, і ў садоўніцкіх крамах. У асартыменце — біяакустычныя мадэлі, а таксама дынамічныя (напрыклад, паветраныя змеі), гукавыя і лазерныя. Каштуюць яны па-рознаму: ад 40 рублёў да 500 і вышэй. Наколькі эфектыўная кожная канкрэтная мадэль, можна высветліць толькі на практыцы.

● Калі жадаеце сэканоміць на куплі адпужвальніка, можаце проста ўсталяваць у садзе радыё: гукі музыкі і чалавечай гаворкі (асабліва калі радыё будзе працаваць на высокай гучнасці) адпудзяць крылатых. Але тут узнікае пытанне: як да такіх «канцэртаў» паставяцца суседзі?

● Яшчэ адзін нестандартны варыянт — пайсці ад адваротнага, і замест таго, каб «ваяваць» з птушкамі, пасябраваць з імі. Усталяваць на ўчастку паілкі для птушак. Здавалася б, навошта клікаць у госці крылатых, калі хочаце выратаваць ад іх ураджай? Але ж у спякоту птушкі, як любыя жывыя істоты, адчуваюць смагу. Яны спаталяюць яе ягадамі і пладамі. Напіўшыся вады, з'ядуць яны менш. І такім чынам вы захаваеце свой ураджай.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ЧЫМ БОЛЬШ МОЗГ «ПРАМЫВАЮЦЬ», ТЫМ БОЛЬШ ЁН «БРУДНЫ»

Чым адрозніваецца мысленне і псіхалогія «левых» і «правых»

Нашы асабовыя якасці вызначаюць не толькі наш характар і паводзіны, але, як высвятляецца, і нашы палітычныя погляды. Калі па жыцці мы кансерватары, з цяжкасцю мяняем свае звычкі, любім парадак і дыскамфорту, хутчэй за ўсё бліжэй нам будуць «правыя» погляды. Калі ж мы адкрыты да ўсяго новага, лёгка ставімся да змен, то ўспрымем «левыя» ідэі. Дарэчы, з вялікай дакладнасцю гэта вызначыць можна нават па МРТ галаўнога мозгу. Якімі ўсё ж якасцямі валодаюць прадстаўнікі «правых» і «левых»? Чаму паўнацэннаму грамадству патрэбны і першыя, і другія? Што ператварае людзей у прыхільнікаў радыкальных ідэй — «ультраправых» ці «ўльтралевых»? Пра гэта расказаў нейрахірург, навуковы супрацоўнік аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Гумен ГАРБАННІДЖАД.

— Гумен, каго адносяць да «правых», а каго — да «левых»?

— «Правымі» называюць тых, хто жадае захаваць існуючае становішча, гэта кансерватары. «Левыя» — тыя, хто выступае за перамены, перабудову грамадства, па-іншаму іх называюць радыкаламі. І навука мае тлумачэнні, чаму ў людзей розныя погляды.

У кожнага чалавека ў той ці іншай ступені прысутнічае пяць галоўных асабістых якасцяў, якія ўплываюць на яго паводзіны і характар. Гэта адкрытасць (змяненням, новаму вопыту, інфармацыі), паслухмянасць, экстраверсія, абаянне і неўратызм. Для таго каб разабрацца ў структуры мыслення «правых» і «левых», мы зважаем толькі на дзве першыя якасці — адкрытасць і паслухмянасць.

Каб вызначыць, да «левых» ці «правых» адносіцца чалавек, праводзілі розныя тэсты. Напрыклад, задавалі такія пытанні: «Вы ўвесь час харчуецеся ў адным і тым жа рэстаране ці ў розных?», «Заказваеце розную ежу ці ўвесь час адну і тую ж?», «Вы хочаце пабываць ва ўсіх рэстаранах вашага горада ці харчавацца ў адным?» Тое ж датычылася адзення, адпачынку і кола зносін: «Вы заўсёды адзяваеце адзін тып адзення ці любіце рознае?», «Адпачываеце ў адным і тым жа месцы ці ў розных?»

Чым больш людзі адкрытыя да новага, тым больш яны творчыя, актыўныя, хутчэй знаходзяць выйсце з розных сітуацый, цікавяцца ўсім новым. Яны любяць розныя віды творчасці. Напрыклад, у іх дома хутчэй за ўсё будуць карціны не самых традыцыйных кірункаў жывапісу. Пры гэтым яны з'яўляюцца вельмі адчувальнымі і моцна рэагуюць на пачуцці іншых людзей: сумуюць і весяляцца разам з іншымі. Такія людзі часцей скасоўваюць шлюбы. І яны больш прытрымліваюцца «левых» поглядаў, адпаведна самі часцей з'яўляюцца членамі «левых» партый ці галасуюць за «левыя» партыі.

Каб ацаніць ступень паслухмянасці, пыталі: «Ці своечасова вы выконваеце сваю работу?», «Ці плануеце свае справы?», «Калі вам паставілі задачу, вы імкнецеся добрасумленна яе выконваць ці не?», «Калі хочаце дасягнуць мэты, дзеля гэтага шмат працуеце?», «Калі адчуваеце, што не можаце своечасова выканаць запланаванае, адчуваеце себе дыскамфортна?» У паслухмяных людзей творчае мысленне менш развіта, чым у адкрытых. Сваю работу яны выконваюць вельмі добрасумленна, але калі ўзнікаюць нейкія ўскладненні, ім цяжэй знайсці альтэрнатыўнае выйсце, таму часта проста «завісаюць».

Гэтыя людзі менш схільныя скасоўваюць шлюбы, аддаюць перавагу простаму дызайну ў доме, у іх больш прымітыўныя карціны. Яны з цяжкасцю мяняюць свае звычкі, пры гэтым больш задаволены сваім жыццём, менш ужываюць алкаголь, больш добрасумленныя ў рабоце і адносяцца да «правых»: найчасцей галасуюць за «правыя» партыі.

Чым больш балаў атрымліваюць людзі па шкале паслухмянасці, тым менш яны адкрытыя да новага: вопыту, змяненняў і іншага, і наадварот.

У гэтым кірунку праводзіў сацыяльныя эксперыменты адзін з перадавых вучоных — амерыканскі прафесар Джонатан Хейт. Для такіх доследаў дастаткова 10—15 тысяч чалавек, у яго ж у некаторых эксперыментах удзельнічала да 300 тысяч. Прапаноўвалася пяць сітуацый. Калі чалавек адказваў, што зробіць прапанаванае без грошай, ён не атрымліваў балаў, за 100 долараў — 1 бал, тысячу долараў — 2 балы, 10 тысяч — 3 балы, ні пры якіх умовах не зробіць — 4 балы.

Першая — «Ці згодны ўкалоць іголкай руку дзіцяці?» пры тым, што іголка стэрыльная і шкоды здароўю дзіцяці, акрамя болю, не прынясе. Тут «левыя» нязначна больш, чым «правыя», атрымалі балаў. Гэты тэст вызначаў узровень эмпатыі да людзей.

Другая прапанаваная сітуацыя: «Ваш сябар купіў скрадзены тэлевізар і ім карыстаецца. Ці згодны вы пазычыць яго і таксама карыстацца?» Вялікай розніцы ў набраных балах не было і тут. Пераважная большасць адказала адмоўна. Гэты тэст правяраў узровень справядлівасці.

Трэцяе пытанне — «Ці згодны вы замежным журналістам расказаць пра недахопы сваёй краіны?», прычым не прыдумваць, а праўдзіва назваць слабыя месцы. І тут паміж «левымі» і «правымі» атрымалася вельмі вялікая розніца. «Правыя» сказалі, што яны не згодны зняславіць сваю краіну, а калі і зробяць гэта, то за вельмі вялікія грошы. А «левыя», наадварот, былі згодны нават без грошай расказаць пра тое, што не падабаецца. Такім чынам вывучалася адданасць. Насамрэч у ЗША спяванне гімна, дэманстрацыя сцяга на тым жа адзенні, патрыятызм больш характэрныя для «правых», чым для «левых».

Чацвёртае пытанне «Ці згодны вы ў камедыйным спектаклі даць аплявуху вашаму тату?» пры тым, што тата ведае, што гэта камедыя і ён згодны. Тут пры адказах таксама была вялікая розніца. «Левыя» пагадзіліся бясплатна ці за дробныя грошы. А «правыя» пагадзіліся або за вельмі вялікія грошы, або ўвогуле ні пры якіх умовах не сталі б гэтага рабіць. Гэты тэст вызначаў павагу да ўлады і аўтарытэту. «Правыя» тут нашмат апярэдзілі «левых».

Апошняе пытанне «Ці згодны вы ў камедыйным спектаклі стварыць вобраз жывёлы: поўзаць, як змяя, крычаць, як малпа, і смяяцца такім чынам людзей?» Зноў-такі была вялікая розніца. «Правыя» сказалі, што не будуць гэтага рабіць, а калі і будуць, то за вельмі вялікія грошы. А «левыя» пагадзіліся дзеля камедыі паўдзельнічаць нават бясплатна. Тут вывучаўся ўзровень праведнасці.

Самае цікавае, што пры МРТ галаўнога мозгу людзей «левых» і «правых» поглядаў можна адрозніць па актыўных нейронных сувязях, яны знаходзяцца ў розных месцах галаўнога мозгу, прычым з істотнай дакладнасцю — 70 %.

Таксама было праведзена даследаванне ў Вялікабрытаніі. Яно паказала, што дзеці, якія ва ўзросце пяці–сямі гадоў ідуць супраць волі бацькоў і пастаянна з імі спрачаюцца, калі вырастаюць, становяцца «левымі» і галасуюць за «левыя» брытанскія партыі. Той, хто з дзяцінства не згодны з парадкам, не мае «правага» мыслення і не любіць дысцыпліну ў дарослым узросце.

— Як у «левых» грамадствах жывуць людзі «правых» поглядаў?

— Нават калі ўсё грамадства лічыцца «левым», у ім ёсць «левыя» і «правыя». Псіхалагічныя якасці ўсіх людзей не могуць супадаць з палітычным ладам. Нельга ўсіх зрабіць «левымі» ці «правымі». «Правыя» нават у «левай» краіне знаходзяць сябе ў тых сферах, дзе трэба наводзіць парадак.

Дарэчы, людзі «правых» поглядаў вызначаюцца больш высокай дысцыплінай мыслення, чым «левыя». Напрыклад, было такое даследаванне. Па цэнтры манітора быў размешчаны мем, які паднімаў і апускаў вочы, глядзеў налева ці направа. Пры гэтым з розных бакоў экрана з'яўляўся мяч. Напрамак позірку мема не супадаў з тым, адкуль выходзіў мяч. Людзей прасілі не зважаць на рухі мема. І людзі «правых» поглядаў сапраўды амаль не звярталіся ўвагу на мем, у адрозненне ад людзей «левых» поглядаў. Яшчэ адзін аналагічны эксперымент — пісалі ручкай зялёнага колеру з чырвоным чарнілам і пыталіся, які колер у ручкі. «Правыя» больш дакладна адказвалі, што ручка зялёная, а «левыя» больш памыляліся.

— Ці магчымае цалкам адналярнае грамадства?

— Сам прафесар Хейт казаў, што ў яго было больш «левае» мысленне. Але пасля правядзення даследаванняў ён пераканаўся, што абсалютна «левае» ці абсалютна «правае» грамадства немагчыма. Часам можна пачуць, што калі ўсе будуць «левымі», гэта будзе ідэальнае грамадства, ці наадварот. Трэба разумець, што для стварэння збалансаванага грамадства, якое магло б рухацца наперад і развівацца, павінны быць людзі з «левым» і «правым» мысленнем. Падчас эвалюцыі так склалася: частка людзей нараджаецца з «левым» мысленнем, частка — з «правым». Нават калі цалкам ачысціць грамадства, калі

зменіцца пакаленне, нягледзячы на папярэднюю татальную зачыстку, у наступным пакаленні з'яўляюцца людзі з іншым мысленнем.

Уявім, што магло б быць, калі б грамадства складалася выключна з «правых», а яны ўсе дысцыплінаваныя, паслухмяныя, не хочуць нічога мяняць. Але ж свет увесь час развіваецца, і такое грамадства заставалася б на адным месцы, буксавала, не развівалася і з часам проста знікла б.

Калі б усё грамадства складалася з «левых»... А яны пераменлівыя, законанепаслухмяныя, пастаянна экспериментуюць, ад чаго ствараецца хаос. Такое грамадства таксама няўстойлівае. У ім павінен быць хтосьці, хто сочыць за законам, парадкам, каб была стабільнасць, а за такіх адказваюць «правыя». Таму нельга, каб грамадства было толькі «левае» ці толькі «правае».

Напрыклад, СССР лічылі краінай эксперыментаў. Там многае рабілі, што потым аказалася немэтазгодным і нават шкодным, у тым ліку цаной тысяч чалавечых жыццяў. Будавалі Беламорканал, які аказаўся амаль бессэнсоўным, з-за сельскагаспадарчых эксперыментаў па вырошчванні бавоўны высахла Аральскае мора... Гэтыя прыклады ілюструюць, што бывае, калі робіцца шмат спроб і няма тармазоў.

Як паказвае гісторыя, крайне «правыя» грамадствы ці крайне «левыя» не могуць доўга існаваць і прыгавораны да самазнішчэння і самараспаду, калі сама сістэма не будзе гнуткай.

— Як растлумачыць з'яўленне людзей радыкальных, крайніх поглядаў?

— Наш мозг мае такую ўласцівасць: чым больш яго «прамываюць», тым больш «брудным» ён становіцца. У нармальным грамадстве колькасць «ультралевых» і «ўльтраправых» нязначная. Калі грамадства падвяргаецца гвалту, рэвалюцыям, войнам, рэпрэсіям, «правыя» ператвараюцца ва «ўльтраправых», а «левыя» — ва «ўльтралевых». Парушаецца баланс, што заўсёды небяспечна ўнутранымі грамадзянскімі войнамі, рознагалоссямі, гвалтам, раздзяленнем і распадам грамадства.

Прычым англасаксы разумелі гэта шмат гадоў таму і пачалі выкарыстоўваць, ператвараючы «левых» ва «ўльтралевых», «правых» — ва «ўльтраправых», ствараць расколы ў грамадстве па прынцыпе «раздзяляй і ўладар». Такіх прыкладаў шмат. Адзін з іх — Эрытрэя. Да пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя такой краіны на карце свету не было, яна ўваходзіла ў склад Эфіопіі. Сёння гэта вельмі бедная краіна з таталітарнай сістэмай кіравання, там абавязковая служба ў войску, на якую грамадзян прызываюць на няпэўны тэрмін, з-за чаго многія эрытрэйцы пакідаюць радзіму. У 1890 годзе Італія хацела захапіць Эфіопію, якая лічылася «залатой жылай» Афрыкі. Аднак людзі трымаліся адзін за аднаго, і Італіі ўдалося «ўзяць» толькі невялікую частку краіны з выхадам да мора, якая стала першай калоніяй Каралеўства Італія на ўзбярэжжы Чырвонага мора.

Пасля Другой сусветнай вайны англічане атрымалі ўплыў над гэтай тэрыторыяй. Эрытрэйцы хоць і хацелі аб'яднання з Эфіопіяй, але за гэты час ператварыліся ва «ўльтраправых» і «ўльтралевых». Пачаліся ўнутраныя войны, прычым ваявалі ўсе: мусульмане, хрысціяне, камуністы, а звышдзяржавы падтрымлівалі розныя групоўкі. Пасля распаду СССР частка байцоў засталася без падтрымкі, Эфіопія і Эрытрэя ў выніку раздзяліліся. Вось так адна нацыя, якая калісьці была адзінай краінай, ператварыўшыся ва «ўльтраправых», пачала братазабойныя войны.

Калі ў 1993 годзе Эрытрэя стала незалежнай, нягледзячы на тое, што краіна разбітая, яна пачала па чарзе ваяваць з суседзямі. На першы погляд здаецца неразумным, калі новыя людзі прыходзяць да ўлады ў краіне з няўстойлівым ладам і пачынаюць ваяваць. Аднак гэта адмысловая палітыка, калі патрэбны выдуманыя ворагі і войны. Апошняе дазваляе растлумачыць унутраныя эканамічныя нелады — краіна вае, да таго ж улады быццам бы выратоўваюць яе ад ворагаў. Гэта ўніверсальны прыём, калі прыходзіць новая ўлада пасля рэвалюцыі ці вайны.

Алена КРАВЕЦ.

Будзьце ўважлівыя

Каб зніжкі не аказаліся пасткай

У рукі хітрых махляроў трапляюць нават топ-персоны

Спецыялісты фінансавага рынку адзначаюць, што лета — удалая пара для ашуканцаў, бо нашы людзі ў гэты час становяцца больш даверлівымі.

«Верагодна, на пільнасць уплывае спякота і сезон адпачынкаў. Людзі спяшаюцца ўсё паспець да водпуску. У перыяд падрыхтоўкі неабходна закупляць мноства сезонных аксесуараў. А гэта спалучана з вялікімі выдаткамі і жаданнем абавязкова сэканоміць. Тут і адбываецца зніжэнне ўвагі і беспадстаўная ўпэўненасць, што менавіта табе казачна пашанцавала. У гэтым выпадку людзі хутка згаджаюцца на пакупкі з вялікімі зніжкамі. І, як правіла, гэта становіцца фатальнай памылкай для іх», — кажа **Вячаслаў СЕНІН, эксперт па інтэрнэт-плацяжах і дырэктар кампаніі правайдара электронных плацяжоў Assist Belarus.**

Паводле слоў спецыяліста, існуе і іншы спосаб. Гэты распаўсюджаны метад падману пачынаецца з таго, што кліент робіць заказ, а прадавец сцвярджае, што тавар скончыўся, і прапануе адмяніць куплю. Затым ён накіроўвае пакупніка на іншы сайт, дзе тавар нібыта даступны па лепшай цане, даючы спасылку для здзяйснення пакупкі.

Менавіта на гэтым этапе пакупнік можа трапіць у пастку. Прадстаўленая спасылка можа быць часткай фішынгавай атакі, што прывядзе да ўцечкі асабістых і фінансавых даных.

Існуюць часовыя пасткі для аматараў «казачна танных» паслуг за мяжой менавіта для адпускнікоў. Непасрэдна сёлета адбылася адна рэальная сітуацыя махлярства, калі жыхар Мінска (вядомая медыяперсона) страціў больш за 1000 рублёў пры браніраванні жылля, каб паехаць у падарожжа. «На падробленым сайце чалавек унёс перадаплату, і далей сувязь з «адміністратарам сайта» абарвалася», — распавёў эксперт.

Актуальнасць кіберзлачынстваў не падае. Што ж датычыцца статыстыкі, то ў мінулым годзе, па даных інфармацыйных агенцтваў, адбылося 1,7 мільёна нападаў у сетцы інтэрнэт з выкарыстаннем праграм-вымагальнікаў, і ў 71 % прыватных выпадкаў па ўсім свеце ашуканыя становяцца ахвярамі дадзеных праграм.

Сяргей КУРКАЧ.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607**
Продавец	**ОАО «Хойникский завод гидроаппаратуры», Гомельская область, г. Хойники, ул. Мира, 41**
Оператор ЭТП/ Адрес ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов
Месторасположение:
Гомельская область, г. Хойники, ул. Мира, 41

Лот №	Марка, модель	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
1	**Прицеп бортовой MAZ 8926 017 002,** 2008 года, р/зн. 1857 АА-3, № кузова Y3M89260080001380	4 820,00
2	**Прицеп бортовой MAZ 892600 2011,** 2019 года, р/зн. А 5681 В-3, № кузова Y3M892600K0002257	22 920,00
3	**Грузовой бортовой тентовый MAZ 53362,** год выпуска не определен, р/зн. АІ 4947-3, № кузова Y3M533620T0001383	10 200,00
4	**Легковой специальный седан (Sedan) SKODA SUPERB**, 2007 года, р/зн. 2002 ВВ-3, № кузова TMBDL23U289006960	9 600,00

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минску), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Срок оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.
Ответственность участника аукциона, его **права и обязанности, штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **10 %** от цены продажи лотов № 1 и 4, **8 %** от цены продажи лотов № 2 и 3 в течение **3 (трех) рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**17.09.2024 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 16.09.2024 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**
Контактные данные	**Тел.: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Петриковский комбинат бытового обслуживания» (продавец) извещает о проведении 18 сентября 2024 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
	Условия продажи: возместить затраты продавцу, связанные с оформлением и продажей объекта в течении 10 календарных дней после проведения аукциона в сумме 8006,44 бел. руб.		
1	- **Капитальное строение с инв. № 335/С-76637,** общей площадью **62,5 кв. м,** назначение – здание специализированное лесохозяйственного назначения, наименование – **здание пилорамы**. Адрес: Гомельская обл., Петриковский р-н, г. Петриков, ул. Карла Маркса, 80/3. - **Капитальное строение с инв. № 335/С-76638,** общей площадью **10,7 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад ГСМ**. Адрес: Гомельская обл., Петриковский р-н, г. Петриков, ул. Карла Маркса, 80/2. - **Капитальное строение с инв. № 335/С-76639,** общей площадью **289,9 кв. м**, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **гараж**. Адрес: Гомельская обл., Петриковский р-н, г. Петриков, ул. Карла Маркса, 80/1. - **Капитальное строение с инв. № 335/С-790170,** общей площадью **403,8 кв. м**, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **столярный цех, гаражи**, составные части и принадлежности: А1/к-Столярный цех, гаражи, 1-Пристройка, 2-Пристройка, 3-Пристройка, а-Навес, б-Навес. В том числе оборудование: 1. фрезерный станок (инв. № 422); 2. торцовочный станок (инв. № 687); 3. заточный станок (инв. № 391); 4. лесорамма и электрощит Р-634 (инв. № 404); 5. конвейер на ленточной передвижке (инв. № 402). Адрес: Гомельская обл., Петриковский р-н, г. Петриков, ул. Карла Маркса, 80/4. - **Капитальное строение с инв. № 335/С-790169,** общей площадью **70,9 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание административное, составные части и принадлежности: А1/д-здание административное, 1-Пристройка. Адрес: Гомельская обл., Петриковский р-н, г. Петриков, ул. Карла Маркса, 80. **Информация о земельном участке:** расположено на земельном участке с кадастровым номером **324350100001001043,** общей площадью **0,6984 га (право собственности)**. **Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Петриковский р-н, г. Петриков, ул. Карла Маркса, 80. **Целевое назначение земельного участка:** для размещения объектов бытового обслуживания населения	**207480, 28**	**10 374, 01**

Продавец: открытое акционерное общество «Петриковский комбинат бытового обслуживания», 247940, г. Петриков, ул. Гагарина, 16.

Порядок ознакомления с имуществом (осмотр) и заключение договора купли-продажи осуществляется по контактному тел. **8 (029) 657-81-94, Мойса Инна Николаевна.**

Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца торгов (Открытое акционерное общество «Петриковский комбинат бытового обслуживания»):** р/с BY94BAPB30122460100130000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК BAPBBY2X, УНН 400031909, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 19 августа 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 16 сентября 2024 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона, оплатить приобретаемое имущество Продавцу в течение **10 (десяти) календарных дней** после подписания договора купли-продажи.

Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by (раздел «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база»).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.

Информация о проведении открытого аукциона 20 сентября 2024 г. по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в пос. Усяж, аг. Усяжа, дер. Кривая Берёза

Организатор аукциона: Усяжский сельский исполнительный комитет, 222212, пос. Усяж, ул. Комсомольская, д. 10.

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь (га)	Целевое назначение	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)
1	пос. Усяж	624885606601000057	0,1499	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	15 000,00
2	аг. Усяжа, ул. Луговая, 15А (объект № 58/2022)	624885606701000263	0,15	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	9 000,00
3	дер. Кривая Берёза, ул. Луговая, 36 (объект № 84/2022)	624885603601000296	0,1176	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	15 000,00

Аукцион состоится **20 сентября 2024 г. в 15.00** в Усяжском сельском исполнительном комитете по адресу: ***пос. Усяж, ул. Комсомольская, д. 10***, кабинет председателя.

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by, http://rlt.by/ru; Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by; Минского областного исполнительного комитета.

УНП 600023836

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец).

Электронные торги состоятся 18.09.2024.

Лот № 1: Магазин с инв. № 400/D-23124.

Согласно ведомости технических характеристик (далее – ВТХ): площадь – 782,8 кв. м.
Адрес: Гродненская обл., г. Гродно, ул. Стефана Батория, 6-41.
Магазин с инв. № 400/D-23124 находится в кап. строении с инв. № 400/С-346, расположенном на земельном участке 440100000002000750 площадью 0,1381 га.

Обременения: ипотека, аренда. На момент объявления торгов на предмет электронных торгов отсутствует технический паспорт, вместо которого выдана ВТХ. Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии приведения предмета торгов в соответствии с Инструкцией, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 24.03.2015 № 11, и получения согласия залогодержателя, поручителей по договору об ипотеке Продавцом. Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.

Начальная цена с НДС 20 % – 2 377 200,00 руб.
Задаток – 237 720,00 руб.
Шаг электронных торгов – 2 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 13.09.2024 в 16.00.

Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52.
torgi@ino.by
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

УНП 190055182

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Папулярная пісьменніца Жанна Міус — аўтар кніг для дзяцей «Первоапрельский суп», «Нескучательная дочка», «Малёк Удалёк і Жах-Рыба», «Сиреневая Соня в Чудесонии» і многіх іншых. Маленькія чытачы з нязменным захапленнем сустракаюць яе вершы і вясёлыя гісторыі, насычаныя моўнымі наватворамі. З поспехам стварае пісьменніца і «дарослую» паэзію і прозу.

Як бачыцца, асаблівая тэма для Жанны Міус — жыццё братоў нашых меншых. У апавяданні, якое прапаноўваецца на конкурс «Звязды», цікавы паварот сюжэта прымушае паразважаць над узаемасувяззю ўсяго жывога ў гэтым свеце. Што цэментуе адвечную сувязь людзей, жывёл, раслін? Дабрыня, толькі дабрыня...

Алена БРАВА.

ДВА КЕШЫ

Жанна МІУС

Чырвоная зрэнка майскага дня павольна хаваецца пад сваімі аграмаднымі — на паўнеба павекамі: сіне-аблокавым зверху і шыза-хваёвым знізу. У гэты таямнічы, між днём і ноччу, час Кеша спяшаецца выслізнуць з утульнага куточка свайго, каб пабегчы адкрываць яшчэ не спазнаныя ім цікавосткі свету. Гняздзечка яго знаходзіцца ў норцы, а норка — пад коранем старой (у тры абхваты) ліпы, на самым ускрайку Слепчыкава рова — так гэтае вясковае ўрочышча празвалі мясцовыя людзі.

Жыў тут калісьці даўным-даўно адметны чалавек — быў ад нараджэння сляпы. Людзі часам цураюцца незвычайнага, бывае нават, без усялякай падставы палохаюцца і прыдумляюць неверагоднае. Гэткім чынам асоба Слепчыка з цягам часу набыла столькі таямнічасці, колькі неабходна для поўнага адасаблення ад вясковага грамадства. Слепчыку прыплялі стасункі з нячыстай сілай, ім нават сталі палохаць дзяцей. І то — хата на водшыбе, над глыбокім ровам, а побач гусціцца таямнічым змрокам стары ельнік. Калі мужчына памёр, прамінуўшы восьмы дзясятак жыцця, калі хуценька разабралі на дровы яго сціплую хатку, — усё, што звязана з гэтым месцам, стала мясцовай тапанімічнай легендай.

Так што Кеша — не проста вожык, ён — вожык з легенды!

Цікаўны вырас Кеша — спрытны, шэры, чарнаносы, са страката-калючай прычоскай, што расла-расла-расла і разраслася ажно з галавы да самага... мізэрнага хвасточка. Вочкі ў Кешы вільготныя, крыху лупатыя, так і шныраюць па блізкім наваколлі — што б гэта смачнае ўхапіць? То чарвяк дажджавы на кратовай рытвіне зазяваецца, то вусень на лістку задрэмле і ў зубатую вожыкаву пашчу трапіць, то жук прыгожы па галінцы сухой будзе бегчы... «Гам!» — быў жук і няма жука! Наогул жа смакаты ў Слепчыкавым рове хапае, Кеша не галадае. Малечы-жабяняткі, слізкія, масляныя смаўжы, слімакі — якіх толькі далікатэсаў у шчодрай прыроды няма! І ворагаў у вожыка тут, паблізу, не назіраецца, а зайцы і казулі, што сюды часам заглядваюць, на малога калючага вандроўніка — нуль увагі.

Але чагосьці ўсё ж Кешы не ставала. Цягнула ў бок нязведанага. А нязведанае было там — унізе рова, дзе віхляста пракладаў шлях у далеч празрысты ручай, дзе была пратаптаная невядома кім сцежка, дзе пахла таямнічымі істотамі. Драпежнікі? Альбо новыя знаёмыя, магчыма, сябры? Як даведацца аб тым?

Як кажуць, і хочацца, і колецца! Але хацелася болей...

Аднойчы ў прыцемку Кеша забег далекавата ад нары, уздоўж берага ручая. І ў адным месцы, сярод густых зараснікаў сніткі, звярок нечакана натрапіў на пераправу — шырокую драўляную кладку.

«Фр-фрх! Чухсі-чуся! Прабягу! Перакачуся!» — зафыркаў задаволены вожык.

Тэп-тэп-тэп — скок! Перашкода ўзята. Небяспечны ручай булькоча знізу, а цяпер ужо і ззаду.

«Фух-фух-фух, які ж я зух!» — падумаў Кеша. Аднак рана радаваўся: наперадзе чакала новая неспадзяванка: сцежка раптам паднялася ў неба. Падымацца па ёй угору вожыку было нязручна. І ён звярнуў на правы — утравелы — бок. Праз некалькі хвілін і гэтая паласа перашкод была адолена. Толькі захапляльныя спаборніцтвы ніяк не хацелі заканчвацца: перад носам узнік высачэзны — у некалькі вожыкавых ростаў — драўляны плот.

Калі б Кеша быў выхаванцам дзіцячага садка, ён, скрывіўшы маленькія чорныя вусны, прамовіў бы пакрыўджана: «Я так не гуляю!» І, магчыма, пайшоў бы плакаць у куток і сапці ад прыкрасці. Але ён быў упартым звярком, настойлівым у пастаўленай мэце. Пасунуўся спярша налева — плот не можа быць бясконцым, дзесьці будзе праход. Жыццё навучыла Кешу абыходзіць перашкоды, якія б вялікія і жахлівыя яны ні былі. Праход намаляваўся ў выглядзе зламанай жэрдачкі. Вось у гэтую шчарбіну на плоце і праслізнуў цікаўны звярок.

— Гр-р-р! — адразу пачулася над вухам.

Вожык адрэагаваў звыклым для яго спосабам: алеоп! — ператварыў тулава ў колкі клубок і сцішыўся: чакаць і не панікаваць! А тое, што імгненне таму выказвала пагрозу, пачало зацікаўлена таптацца побач: абнюхваць, даследаваць.

«Уй-ю-ю...» — жалобна заскуголіла стварэнне, якое гырчэла.

«Ага!» — падумаў супакоены ў сваім недатыкальным становішчы Кеша.

Вожык высунуў нос і ўбачыў невялікага — усяго ў тры яго росты — звера. Воўк не воўк, ліса не ліса — нешта сярэдняе, хоць падабенства назіраецца: у вушах, вусах і лапах. Звер адышоў убок, пасядзеў, падумаў. Затым вярнуўся і раптам... замахаў прывітальна хвастом. Відаць было: не крыўдуе і мае намер прадоўжыць знаёмства.

Рудавата-рыжы сабака, а гэта, канечне, быў ён, павярнуўся і павёў нечаканага госця да свайго жытла — знаёміць і частаваць. Кеша не стаў чакаць асаблівага запрашэння, затупаў услед. Цікава, чым харчуецца гэты лісавоўк?

Ля сабачага «палаца» — невялічкай драўлянай будкі — стаяла міса з ежай. Але Кеша быў выхаваны вожык. Чаго адразу накідвацца на прысмакі? Так не робяць! Перш-наперш неабходна зазірнуць у гасцінны кут — прыстанішча новага сябра. О! Дык тут таксама маецца гняздо, мяккае, улежнае, з сухой травы. Пахне толькі «фу-фу-фу!» — не вельмі прыемна. Але пах чужога жытла з гасцей хутка выветрываецца. Вожык павярнуўся, зрабіў некалькі маленькіх крокаў і апынуўся ля місы.

О! Малачко! І яшчэ нешта... Невядомае, але ядомае! М-м-м... См-м-мачненькае. Кеша так даўно не каштаваў малака — год, не меней. Таму, не марудзячы, усунуўся ў сабачую міску ледзь не ўсім тулавам. І пачаў хутка, сапучы і фыркаючы, паядаць сабачыя недаедкі: «гам-ням-ням...»

І пайшло з таго часу — ледзь на Слепчыкаў роў падаў змрочны цень захаду сонца, вожык Кеша спяшаўся ў сваю любімую «рэстарацыю». Чарвякоў і жукоў вунь колькі заўгодна навокал — еш ад пузіка. А тут меню адмысловае: то хлеб духмяны, то пячэнька, то макароніна. Гэта для нас — нічога асаблівага, а для дзікага звярка — сапраўдны далікатэс.

Падчас адной гурманскай вячэры Кеша пачуў цяжкія крокі за спінай. Над ім схіліўся белы твар. Вочы, нос, вусны... чагосьці не хапае? А-а-а, дакладна: поўсці! Бяспоўсцевы твар — вось гэта нумар! Раптам побач узнікла лапа, не лапа — не, усё ж лапа, але з доўгімі пальцамі і таксама галаскурая. Лапа пачала гладзіць звярка па калючай спіне.

І тут вожык не стрымаўся: рэзка, незадаволена тузануўся ўбок і выдаў сваё нязменнае «Фр-р... Фух-фух!»

— Ах ты ж! Мой калючык... Кеша! — прамовіла галатварая істота і адняла далонь.

Затым звярок пачуў, што крокі аддаляюцца. Але вялікае Яно не спяшалася ўцякаць, сачыла. Цікавала за ім? Навошта? Можа, любіць вожыкаў... есці? Не падобна — схапіла б адразу. І наогул, як Яно даведалася, што вожыкава імя Кеша? Столькі складаных загадак не памяшчалася ў маленькай галаве.

А сабака — маўклівы вожыкаў сябрук — паводзіў сябе даволі спакойна. Сядзеў побач і жангліраваў зацікаўленым позіркам: то на Кешу гляне, то на жанчыну — гаспадыню сваю.

— Рудзька, які ты ў мяне гасцінны, — азвалася жанчына праз некаторы час.

Яна села на нізенькую, сціплую — у адну сухую рассохлую жэрдачку — лаўку пад акном сваёй будыніны і сашчапіла замком рукі на жываце.

— Малайчына, пёся! Трэба будзе цяпер табе болей ежы класці — на дваіх едакоў. Вось і гаспадарка мая з гэтага часу падрасла. Котка Анфіса будзе мне спяваць вуркотныя песенькі доўгімі зімовымі вечарамі. Ты, Рудзік, — суправаджаць да ручая і ў лес, сцерагчы двор. А вожык Кеша... Гм...

Пажылая жанчына, яе звалі Акцябрына Восіпаўна, задумалася, па твары прабеглі відарысы прыемных успамінаў. Заварушыліся маршчыністыя вусны, загарэліся загадкавыя агеньчыкі ў выцвілых вачах, і ледзь улоўная ружовасць праступіла на шчоках.

На пачатку дзевяностых быў у старэйшай групе, дзе яна працавала памочнікам выхавацеля (па-даўнейшаму — нянечкай), цікавы хлопчык з інтэлігентнай настаўніцкай сям'і — Інакенцій Кожык. На дзіцячай галаве настырна калючыліся жорсткія цёмна-русыя валасы. Давяршалі падабенства з вожыкам маленькія, карыя, крыху лупатыя вачаняты, тоненькія вусны і востранькі доўгі носік. Не трэба і казаць, што вожыкаватага Кешу імкнуліся пагладзіць па дзівоснай галаве ўсе, каму ў ахвоту: выхавацелькі, повар і дворнічыха іх вясковага дзіцячага садка «Церамок». Нават бацькі іншых дзяцей не саромеліся падыходзіць. Людзі пры гэтым нязменна з усмешкай прамаўлялі: «Кожык — ты сапраўдны вожык!» На што малы Кеша абурана фыркаў, падымаў угору худзенькія празрыста-белыя ручаняты і скідваў, адпіхваў убок чужое, незразумелае і непрыемнае для яго захапленне.

Хлопчык меў не толькі калючы знешні выгляд — душа яго была таксама недатыкальнай, чуллівай. Пакрыўдзіць Кешу і давесці да слязлівай роспачы было справай адной хвіліны: не той дотык, не тое слова, не той позірк — і ў малога пачыналі слязліва расяніцца доўгія цёмныя вейкі. Адным словам, уразлівы недачэпа! Але з Акцябрынай Восіпаўнай, бадай, адзінай у дзіцячым садку ў Кешы атрымалася даверлівае сяброўства. Яна — о цуд! — не гладзіла малога па галаве і вожыкам ніколі не называла. Затое на прагулцы падносіла ў далоні хрушча, які гудзеў, ярка-чырвоную мітуслівую багоўку, пухнатага вусеня ці іншую кузурку. Кеша доўга і ўважліва разглядваў любое жывое стварэнне, а пасля пачынаў задаваць шмат заалагічных пытанняў, адказы на якія не ведала і сама Акцябрына Восіпаўна.

Што ж, дапытлівы Кеша прыходзіў на наступны дзень і распавядаў ёй падрабязна, з дзіцячай кранальнай сур'ёзнасцю, цікавыя рэчы з жыцця насякомых. І сакрэту ў тым не было: маці хлопчыка выкладала біялогію ў мясцовай школе. Нядоўга — два гады. Інакенцій Кожык адпаведна затрымаўся ў «Церамку» толькі на гэты час, не дабыў нават да выпуску. Яго бацькі з'ехалі ў невядомым напрамку, бо іх абавязковая праца па размеркаванні ў глухой, далёкай ад райцэнтра вёсцы скончылася. Хадзілі чуткі, што яны адправіліся на Украіну — бліжэй да родзічаў Кешавай матулі.

Акцябрына Восіпаўна доўга сумавала па гэтым хлопчыку. І ў сне яна часта падымала руку над яго дзіўнай, нязменнай з гадамі прычоскай — хацела пагладзіць, прылашчыць. Але рука, натхнёна ўзляцеўшы ў чуллівым парыве, праз міг застывала... Рука цяжэла, апускалася, так і не выканаўшы жаданы намер...

Ці магчыма было ўявіць, што калісьці ў адзінокай пажылой кабеты з'явіцца свой уласны калючы Кеша?

Лёс чалавечы — ты адмысловы штукар! І прыдумкам тваім няма межаў.

Кеша, трэба сказаць, быў вельмі адказны выхаванец — прыходзіў на вячэрнюю паверку ў час, як мае быць. Падбягаў спярша да ганка, затым да лаўкі, на якой сядзела задуменная гаспадыня, адпускаў некалькі прывітальных фырканняў і паважна вадзіў туды-сюды вострым носам. Нарэшце пасля ўсіх цырымоній накіроўваўся на дэгустацыю — да Рудзькавай місы. Ён цярпліва адносіўся да жадання вялікай істоты абавязкова пагладзіць яго красу і гонар — неверагодную калючую прычоску. Эх, на якія толькі ўступкі не прыходзіцца ісці за смачны пачастунак!

А аднойчы Акцябрына Восіпаўна выйшла на ганак і ўбачыла ля сабачай місы двух вожыкаў. Кеша прывёў сябра? Гм, сяброўку? Сабака ляжаў побач і віхляў неспакойным кудлатым хвастом. А вожыкі без сарамлівых умоўнасцяў наперабой чвякалі, глыталі і фырчэлі ад задавальнення.

...Ружовае вока світання заўзята, з дзіцячым інтарэсам, высочвае-цікуе новы дзень. Падглядвае з-за агромністай шыза-хваёвай лясной павекі хвіліну-дзве — не болей. Затым мяняе эмоцыю і, адпаведна, колер і пачынае дзелавіта перамяшчаецца ўверх — на небасхіл: аглядаць, асвятляць, саграваць. Вока штодзённа, безліч гадоў, займае адно пытанне: як тут, пасля няўтульнай цемры, на гэтым напаўсонным свеце, ці ўсё ладна?

— Дзякуй богу, ладна ўсё, — прамаўляе ў адказ Акцябрына Восіпаўна, клыпаючы на свой сціплы гародчык.

Жанчына бярэ ў куточку ля плота матыку і пачынае рыхліць счарсцвелую скарынку зямлі каля востра-колкіх зялёных чубоў цыбулі. Рукі — у руху, а галава занята вярэдлівай думкаю — прыдумаць імя яшчэ аднаму гадаванцу. Та-а-ак, а хто з дзяўчынак у іх «Церамку» таксама вылучаўся «калючым» норавам, недатыкальнай вожыкаватасцю? Трэба пакапацца ва ўспамінах. Нібыта ў цацачным стракатым калейдаскопе, закруціліся ў старэчых вачах маленькія мілыя тварыкі: Верачка Барэйка? Шурачка Шыловіч? Палінка Яхнавец?

Не! Першая, нібы рыжая вяртлявая вавёрка, скакала і караскалася па дзіцячых турніках на пляцоўцы. Другая засяроджанай рабой курачкаю грабла пясок у пясочніцы. А трэцяя, падобная на беленькую, далікатную, вуркатлівую котку, даверліва прыціскалася да Акцябрыны Восіпаўны.

Хіба што Аля? Алька Чубанос! Колкі позірк. Востры нос...

Таццяна НЕРСІСЯН:

«Ажыццяўляць цуд вялізная

Галоўны мастак Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек занятая падрыхтоўкай да новага спектакля, а яе майстэрня напоўнена дзіўнымі прадметамі і персанажамі, якія нараджаюць знаёмыя з дзяцінства эмоцыі: плот вясковай хаты, вядзерцы для вады, якія ператвараюцца ў лялек-дзяцей... Найбольш загадкавы спектакль — заўсёды той, што будзе. Хаця многія пастаноўкі, да якіх мела дачыненне Таццяна Нерсісян, прымушаюць гледачоў паднапружыцца, зазірнуць у сябе, каб адшукаць сапраўдную таямніцу. Праўда, калі спектакль паспяховы, у асноўным усе лаўры ад гледачоў дастаюцца рэжысёру. Хаця праца мастака шмат у чым вызначае ўзровень пастаноўкі, на што звяртаюць увагу прафесіяналы: Таццяна — лаўрэат шматлікіх прэмій, у тым ліку Нацыянальнай тэатральнай, атрымлівала высокія адзнакі журы міжнародных фестываляў, што пацвярджае ўзровень беларускай мастацкай і тэатральнай школы — пра гэта і пайшла наша размова.

— Вы паступалі ў Акадэмію мастацтваў і маглі, напэўна, выбраць любы кірунак. Але выбралі тэатр і замацаваліся менавіта ў тэатры лялек. Чым быў прадыктаваны такі выбар?

— Я хацела паступаць на манументальны жывапіс. Калі паступала, была маленькая, худзенькая, і мне сказалі, што фізічна магу не справіцца з такой працай. Але тады якраз быў набор на спецыяльнасць мастака тэатра лялек — і ў мяне не было ні секунды роздуму. Пасля іспытаў было сумоўе. Алена Рыгораўна Фаміна, якая набірала курс, задала такое ж пытанне: «Чаму?..» І я адказала, што ў тэатры лялек сумяшчаецца вялізная колькасць кірункаў: скульптура, архітэктура, анімацыя, жывапіс, графіка... Усё, што магчыма ў мастацтве, прысутнічае ў працы мастака тэатра лялек. Тут можна рэалізаваць любыя ідэі.

Першае знаёмства з тэатрам лялек у мяне было яшчэ падчас вучобы ў школе. У Палацы мастацтва праходзіла выстава работ мастакоў тэатра. Там былі і лялькі Фаміной. Тая выстаўка зрабіла на мяне моцнае ўражанне. Потым я паступіла ў вучылішча імя Глебава, скончыла аддзяленне жывапісу. Перада мной стаяла пытанне: ісці выкладаць ці паступаць далей. Пашанцавала, што лёс падараваў унікальную магчымасць паступіць менавіта на мастака тэатра лялек. Мне гэта падабаецца, не ўяўляю сябе ў нейкім іншым кірунку ці прафесіі.

— Памятаеце сваю першую тэатральную работу?

— Мы вучыліся шэсць гадоў, і падчас вучобы рыхтавалі праекты, курсавыя работы, потым дыпломную. А самая першая работа ў тэатры лялек — яшчэ падчас вучобы — адбылася дзякуючы таму, што мне прапанаваў супрацоўніцтва Аляксей Анатольевіч Ляляўскі. Ён ставіў спектакль у Іспаніі, я да той пастаноўкі рабіла лялькі, а Валерый Яўгенавіч Рачкоўскі працаваў над дэкарацыямі. Потым быў праект у філармоніі «Тры вясёлыя фарбы». Гэта быў своеасаблівы эксперымент: я малявала карцінкі ў рэжыме рэальнага часу, і праектар іх адлюстроўваў на экране. А першай у Беларускім дзяржаўным тэатры лялек была пастаноўка «Усе мышы любяць сыр».

— Бывае так, што чалавек паспрабаваў і разважае: тое гэта ці не. У вас не ўзнікала сумневаў у сваім выбары?

— Сумневаў у прафесіі не было. Мне знаёмыя сумневы іншага характару. Калі працуеш над нечым, то заўсёды сумняваешся: а ці будзе гэта добра? ці будзе гэта цікава? як гэта ўспрымуць? Ну, і самае галоўнае — калі табе самому цікава тое, што робіш, калі цябе ці рэжысёра здзіўляе нейкая знаходка або рашэнне, тады ты разумееш, што ўсё не дарма.

Мы ставім спектаклі і для дзяцей, і для дарослых. І незразумела, што больш складана. У мяне шмат дзіцячых пастановак у Мінску, Брэсце, Магілёве, Маладзечне, у расійскіх тэатрах.

— Для каго больш падабаецца працаваць — для дзяцей ці для дарослых?

— Калі доўга робіш нешта ў адным кірунку, у нейкі момант праца можа здацца прэснай. Хочацца часам заглыбіцца ў нешта брутальнае, як «Нататкі юнага лекара», а потым вынырнуць і зрабіць «Разумны сабачка Соня», атрымаць ад гэтага задавальненне — эстэтычнае, каляровае, эмацыянальнае. Я атрымліваю асалоду, калі малюю, асабліва калі гэта прыносіць цікавы вынік. Тое, што робіш, павінна быць цікава найперш табе самому, а інакш і гледачу будзе сумна, калі ты сумуеш.

— Вы робіце для сябе нейкую каляровую партытуру, калі чытаеце тэкст ці знаёміцеся з матэрыялам?

— Я спрабую ўбачыць колер, калі чытаю твор. Незразумела, з чаго пачынаць працаваць, гэта заўжды праблема. І кожны спектакль пачынаеш нібыта з нуля, быццам за плячыма няма гэтага досведу (у мяне каля 100 пастановак, можа больш). Таму што кожны раз гэта новы твор, нават калі працуеш з нейкай назвай другі раз, то ўсё роўна трэба па-іншаму пераасэнсаваць тэкст. І кожны раз думаеш: з чаго пачынаць, колькі неабходна касцюмаў, дэкарацый, святла?.. Нараджаюцца выявы і першыя накіды — спачатку гэта проста нейкія адчуванні. Напрыклад, «Разумны сабачка Соня»: хацелася бачыць вельмі сонечны жоўты пакой. І ад гэтага жоўтага пакоя пайшло ўсё астатняе. Усе спектаклі па-рознаму пачынаюцца, але ў працэсе работы пачынаюць абрастаць дэталямі. Ад нейкага пункту адштурхоўваешся і быццам бы збіраеш пазл: каб гарманічна спалучалася адно з адным. Наогул, я вельмі люблю колер і дзіцячыя спектаклі імкнуся рабіць вельмі яркімі.

— А эскізы вы робіце па сцэнах, ці з агульным падыходам да вобраза спектакля?

— Я аддаю перавагу таму, каб маляваць па сцэнах — і мне, і рэжысёру так больш зразумела. І зразумела, як будзе мяняцца прастора: дзе шмат дзеяння, дзе мала... Але я не малявала па сцэнах спектаклі, якія мы з Яўгенам Карнягам паставілі ў РТБД. Таму што, па-першае, там зададзена агульная канцэпцыя, а па-другое, дзеянне нараджалася па ходзе работы рэжысёра з акцёрамі — у такіх пастаноўках, напрыклад, як «Шлюб з ветрам», «Пачупкі», «Забалоцце».

— Больш любіце працаваць з лялькамі ці з акцёрамі?

— Па-рознаму. А лепш, калі гэта чаргуецца. Таму што ад аднаго прыёму ці нават ад аднаго стылю стамляешся. Чаму мне цікава працаваць у РТБД? Таму што там драматычныя артысты, а ў мяне такога досведу было не надта шмат. Некалькі пастановак у драмтэатры за мяжой — «Віно» і «Адысей, вяртайся дамоў» рэжысёра Яўгена Карняга. Але ўсё роўна Яўген бярэ прадмет, працуе з ім, пераўтварае яго ў ляльку. Любыя выразныя сродкі толькі дапамагаюць данесці ідэю.

— У вашых спектаклях для дарослых, якія з'явіліся апошнім часам, яркасць не столькі каляровая, колькі сэнсавая — як быццам высвечваецца «ў чорным-чорным горадзе»...

— Усё залежыць, пэўна, ад твора. Але «чорныя» спектаклі для дарослых — гэта ж канцэпцыя. Ёсць аўтарскія спектаклі, і гэты кірунак быў зададзены рэжысёрам з самага пачатку. Мастак і рэжысёр заўсёды дамаўляюцца загадзя, прымаюць нейкія ўмовы гульні, па якіх потым работа і вядзецца. Таму мы дамовіліся загадзя пра «Пачупкі», Яўген Карняг сказаў: «Хачу чорнае на чорным». Розныя фактуры, але ўсё чорнае — як колер, з якога можа нарадзіцца ўсё. Гэта ж спектакль містычны, прынамсі, для мяне. Як у Метэрлінка была краіна ненароджаных дзяцей, а тут нейкая прастора, дзе чалавечыя душы, якія пайшлі або прыйшлі, збіраюцца нарадзіцца ці пераходзяць у стан нібыта небыцця. Таму там няма святла. Пра «Шлюб з вятрам» так не скажаш, там ёсць і белы колер, і чырвоны. А тут проста ўсё чорнае... Але далей пачалася праца: а якія касцюмы? якія прадметы? якія фактуры?.. Калі нешта пачынаеш прапаноўваць, становіцца зразумела, што менавіта працуе на ідэю. Калі падабаецца і мне, і рэжысёру — то ў гэтым кірунку актыўна працуеш далей. І кампазітар вельмі шмат прыўносіць — музыка моцна ўплывае на ўспрыманне. І калі праца ідзе паралельна, то мы абменьваемся ідэямі: Яўген высылае эскізы кампазітару, мне дае паслухаць музыку, каб гэта ўсё вылілася ў адзінае цэлае, склалася як твор мастацтва.

Але рэжысёр — лакаматыў. Ён выбірае творы, як правіла, выходзячы з таго, што жадае сказаць гледачу. Я лічу, што як бы ні быў цудоўна афармлены спектакль, але калі ў ім няма сэнсу, то ён нецікавы. Там можа быць прыгожа, але сумна. Таму я з вялікай павагай стаўлюся да рэжысёраў, з якімі працую і працавала ў свой час, вельмі паважаю іх меркаванне.

— Былі і іншыя рэжысёры, супрацоўніцтва з якімі аказалася паспяховым, нават прынесла вам «Залатую маску»...

— Важна, каб працавалі аднадумцы, я гэта адчула падчас супрацы з некалькімі рэжысёрамі. Яны вельмі розныя, але мы разумеем адно аднаго. Я не магу ісці супраць уласнай прыроды, і калі нашы погляды супалі — усё будзе добра. Калі я не разумею рэжысёра ці не адчуваю, як ён бачыць кірунак, у якім працуе, то не атрымаецца, як ні старайся. Узаемны давер, згода на ментальным, свядомым, узроўні, павінна быць паміж пастаноўшчыкамі, каб усё атрымалася. Мне цікава быць рознай для розных рэжысёраў. Бо калі працуеш толькі з адным чалавекам, можна трапіць у тупік, паўтараючы адзін і той жа падыход, стылістыку і г. д.

— Але ж вы мастак і ў любы момант можаце маляваць карціны. Ці ёсць у вас творчасць для сябе?

— Няма часу на гэта. Я заканчвала аддзяленне жывапісу, і можна было б нешта паспрабаваць для сябе. Але навошта? Я ж творча рэалізоўваюся. Мне падабаецца кожны раз спрабаваць нешта новае.

— Ці цікавыя вам новыя тэхналогіі і як яны дапамагаюць у тэатры?

— Цікавыя як сродкі выразнасці. У нейкім спектаклі хочацца бачыць праекцыю, а ў нейкіх абмяркоўваем з рэжысёрам: ніякай праекцыі, каб было ўсё жывое. Гэта як яшчэ адна фарба: можна выкарыстоўваць, а можна і не выкарыстоўваць, а замяніць чымсьці іншым. Але я лічу, што ў лялькаў падкупляе гледача тое, калі ён бачыць, што нейкая містыка адбываецца тут і цяпер дзякуючы рукам чалавека. Ніякая тэхніка гэта не заменіць.

— Калі ўжываеце тэхніку, ці ёсць мяжа, колькі яе павінна быць?

— Адчуваеш, колькі трэба. Гэта як з ежай: наеўся — і хопіць. Быў спектакль «Шоўк» Аляксея Анатольевіча, вось там панарамнае відэа для мяне было як асобны персанаж, таму што стварала рамантычны, філасофскі настрой: карты, нейкія японскія іерогліфы. Усё гэта там было вельмі дарэчы. І ў «Шлюбе з ветрам» была праекцыя, што набліжала да гледача момант, які адбываецца тут і цяпер, нават калі здымка вядзецца за кулісамі. Альбо дзяўчаты стаяць на стале, танчаць, а камера здымае толькі іх ногі. І мы бачым, як іх хапаюць мужчынскія рукі. Ідзе канцэнтрацыя ўвагі на гэтым моманце.

— Здаецца, што тэатр развіваецца ў тэхнічным кірунку, а ў «ляльках» усё роўна жывуць лялькі. Наколькі тут важная каманда для мастака?

— Мне здаецца, некаторыя прыёмы «лялечнікаў» ужо пераходзяць і ў драму. Таму я лічу, што тэатр лялек шмат у чым наперадзе. Але гэта яшчэ залежыць ад людзей, якія яго робяць. У нашым тэатры, на мой погляд, сабраліся тыя, хто «не ад гэтага свету» і шчыра любіць сваю справу.

У нас цэлы цэх першакласных майстроў. Два бутафоры займаюцца канструяваннем — Пётр Федарцоў і Алег Уладзіміравіч Нікалайчык. Яны наш мозг. Напрыклад, лялька механізаваная — значыць, павінна быць інжынерная сістэма, каб адкрываліся вочы, рот ці рухаліся рукі пэўным чынам. Яны прыдумляюць механіку, акрамя таго, што робяць іншую бутафорскую працу. Пётр з'яўляецца «маторчыкам», каб ўкараняць новыя тэхналогіі і матэрыялы, вывучаць розныя сродкі вырабу лялек і прадметаў. Асобныя лялечныя дэталі мы ўжо друкуем на 3D-прынтары.

У нас два мадэльеры, якія займаюцца касцюмамі, — гэта Наталля Курганава і Ларыса Лапко. Вельмі шмат шыцця: і касцюмы на артыстах, і касцюмы на лельках, і самі лялькі пашытыя бываюць. Касцюмы на лельках — не значыць, што яны прасцейшыя ў вырабе, чым чалавечыя. Ёсць спектаклі, дзе на лельках паўнавартаснае адзенне, пашытае па фігуры. У «Каляднай гісторыі» шмат такіх лялек у чалавечы рост, натуралістычных, якія апрануты ў нармальнае адзенне. Можна яго было зняць з чалавека, але ўсё роўна трэба было б перашываць. А ў нас і колеры пад вобразы, таму шылі касцюмы спецыяльна для лялек.

Ёсць яшчэ сталяр Дзмітрый Шайко, вельмі добры майстар сваёй справы. Нядаўна да нас на практыку прыйшлі тры студэнткі: Маргарыта Шубянок, Анжаліка Старавойтава і Вольга Лобан, мы іх ужо ўзялі на працу ў тэатр.

Вось, уласна, і ўся наша каманда. Тут не затрымліваюцца людзі, якім гэта не цікава. Тут працуюць толькі тыя, каму менавіта тэатр лялек дарагі, і яны ўсё робяць з любоўю, фантазіяй і адданасцю.

дапамагае каманда»

— Ці патрабавальныя вы як галоўны мастак?

— Сваім цэхам я вельмі даўняраю, супрацоўнікаў паважаю. Мы раімся, як можна ажыццявіць тую ці іншую задумку. Бывае, я прыдумляю нейкую ідэю, але не ведаю, як яе рэалізаваць. Звычайна мяне пытаюцца, як нешта зрабіць, і я павінна ў любым выпадку даць рашэнне. А тут працуюць такія прафесіяналы, што часам я пытаюся: а як гэта можна зрабіць? Калі прыношу ідэю, а ў нас у тэатры прапануюць некалькі варыянтаў ажыццяўлення і ў мяне ёсць магчымасць выбраць той ці іншы варыянт, — проста прыходжу ў захапленне.

Можна прыдумаць што заўгодна, але не ведаць, як гэта тэхнічна ажыццявіць. І калі ёсць такая падтрымка ад супрацоўнікаў, то цудоўна. Па-першае, для іх гэта таксама творчая праца. Па-другое, да такога ўзроўню прафесіяналізму не адзін год трэба ісці, бо няма падручніка, як зрабіць ляльку, каб яна была жывая, магла хадзіць, лётаць, крычаць... Галоўны рэжысёр тэатра Яўген Карняг з нашым другім мастаком-пастаноўшчыкам Вольгай Дваравой рыхтаваў дзіцячы спектакль «Ківі» на Малой сцэне, там дзеючыя персанажы — птушкі. Я бачыла, колькі варыянтаў было: птушка з такімі нагамі не ходзіць, а калі ногі зрабіць іншыя, то акцёру нязручна, а трэба, каб лялька магла быць блізка да дзяцей, пры тым, што сцэна маленькая... Пераробілі некалькі разоў, пакуль не знайшлі прыдатны варыянт. І гэта толькі ногі адной птушкі, а іх там некалькі! А яшчэ павінны быць жывыя крылы... Калі робіш вялікі спектакль для вялікай сцэны, лялькі могуць быць вельмі рознымі і даволі складаныя па механіцы. А калі робіш ляльку, якую можна разглядаць зблізку, хочацца, каб яна была вельмі дакладна зроблена.

Насамрэч ажыццяўляць цуд дапамагае вялізная каманда, таму што можна прыдумаць усё, што заўгодна, але яно не спрацуе, калі не пастараліся супрацоўнікі розных цэхаў тэатра і акцёры.

— Вас як мастака-пастаноўшчыка адзначылі расійскай прэміяй «Залатая маска» за спектакль «Тоўсты сшытак», дзе былі цікавыя лялькі...

— Вельмі любіла гэты спектакль, шкада, што ён ужо не ідзе: сіл у яго ўкладзена было вельмі шмат. Лялькі там былі розныя: ад маленькіх да вялізных. Лялечны тэатр гэтым і ўнікальны: істотны маштаб лялькі ў адносінах да чалавека. Можна стварыць 100 казяўак, якія будуць бегаць па чалавеку, — вось і Гулівер сярод ліліпутаў. Ці можаш зрабіць агромістага салдата, якога дзеці (а іх іграюць маладыя акцёры) знайшлі ў лесе, з вялізнай вінтоўкай — метры тры. Якое ўражанне гэты салдат зрабіў на дзяцей? У драме складана перадаць такія суадносіны, там часцей адзін маштаб. Але ў «ляльках» рознамаштабнасць у адносінах да чалавека дае цікавы эфект.

— Вы «правяраеце» свае работы да таго, як яны пойдуць у тэатры? Магчыма, паказваеце блізкім?

— Магу паказаць. Галоўны, канешне, заўсёды рэжысёр, з якім працуеш. І мужу я заўсёды паказваю свае работы. Ён не мастак, але можа збоку паглядзець і нешта падказаць.

— А што для вас у адзнацы вашай творчасці больш важна: калі ацэньваюць гледачы, калі вы ацэньваеце сябе самі або ацэнка прафесіяналаў?

— Я да сябе больш прыдзіраюся, чым іншыя, напэўна. Я ведаю, дзе і да чаго ў мяне былі пытанні. Часам чытаю водгукі, якія трапляюць на вочы, але спецыяльна не гляджу. Мне прыемна, калі калегі, якім тэатр блізкі і дарагі, даюць высокую ацэнку маёй працы. Часам я магу зайсці ў залу, паглядзець спектакль і потым назіраць, з якім настроем людзі выходзяць. Але гэта бывае вельмі рэдка.

— Што змянілася ў працы са статусам галоўнага мастака тэатра?

— Не ведаю, што для мяне змянілася: я стаўлюся да тэатра гэтаксама, як і заўсёды. Мусіць, мне ўласцівая гіперадказнасць, незалежна ад статусу. І да сябе я патрабавальная была заўсёды: гэта не дае магчымасці расслабіцца і заставацца на нейкім адным узроўні — наадварот, падштурхоўвае імкнуцца да чагосьці новага, шукаць, удасканальвацца.

— Ці быў спектакль, які даўся вам найбольш складана? Ці ў прынцыпе ўсе задачы вырашальныя, і чым больш складана, тым больш цікава?

— Усё складана напачатку, пакуль ты не заглыбіўся і не пачаў жыць у гэтым асяроддзі. У мяне ёсць глыбокае адчуванне, што паставіць можна ўсё.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Кінакрокі

Даніна нямому кіно і падрыхтоўка да «Лістапада»

Кінематаграфісты распавялі пра свае праекты ў юбілейны год

Сярод сёлетніх важных культурных падзей — юбілей беларускага кіно. Сто гадоў таму, 17 снежня 1924 года, выйшла пастанова Савета народных камісараў «Пра кінавытворчасць у БССР» і ў той жа дзень было створана Дзяржаўнае ўпраўленне па справах кінематографа і фатаграфіі пад назвай «Белдзяржкіно». Сённяшнія пераемнікі пачыналі нікаў беларускага кіно з нагоды векавога юбілею рыхтуюць шматлікія цікавыя праекты.

Генеральны дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» Юрый Аляксей распавёў пра той плён кінастудыі, які гледачы ацэняць сёлета. Гэта каля дванаццаці дакументальных фільмаў, што знаходзяцца ў вытворчасці. Сярод іх — стужкі пра нашых герояў-сучаснікаў Аляксея Талая і Аляксандра Мядзведзя, а таксама фільм пра генацыд беларускага народа. Тэма вайны вельмі запатрабаваная, Юрый Аляксей запэўніў: «Мы не стомімся нагадваць усяму свету, як гэта было». Сярод фільмаў на ваенную тэматыку ён згадаў нядаўна выпушчаны ў пракат фільм «Час вярнуцца», прысвечаны аперацыі «Багацыён» і беларускім партызанам. Безумоўна, глядач чакае фільм «Чорны замак». Ён зняты па матывах рамана Уладзіміра Караткевіча, але там паказана сучасная Беларусь. Фільм выйдзе на экраны ў снежні, у найбліжэйшы час плануецца таксама яго адпраўка на міжнародны кінафестываль у Індыю.

Юрый Аляксей адзначыў, што нядаўна беларускія кінематаграфісты ўзялі ўдзел у фестывалі ў Мумбаі, завязаліся кантакты. Цяпер калегі з Індыі прыехалі на «Беларусьфільм», вядуцца перагаворы пра супрацоўніцтва. Пачне здзяйсняцца і сумесны беларуска-кітайскі праект — мастацкі фільм. Яго сцэнарый ужо напісаны, цяпер яго разглядаюць, хутка ў Мінск прыедзе дэлегацыя з Кітая. Такім чынам рэалізуецца беларуска-кітайскі дагавор, які падпісалі ў мінулым годзе на XXIX фестывалі «Лістапад». Вядуцца перагаворы наконт фільма «Бацька Мінай», які будзе зняты сумесна з расіянамі, у Беларусь прыехаў вядомы прадзюсар і акцёр Ігар Угольнікаў. У вытворчасці знаходзяцца і чатыры анімацыйныя фільмы. Сёлета выйдзе першы беларускі 3D-мультфільм пад рабочай назвай «Песня Сірын».

Да стагоддзя беларускага кіно прымеркавана прэм'ера фільма «Дэманстратар». Стужка распавядзе пра першыя крокі кіно на тэрыторыі Беларусі. Рэжысёр фільма Яўген Сяцько так ахарактарызаваў свой фільм: «Няма лепшай ідэі, чым распавесці пра нямое кіно ў стылістыцы нямога кіно». Ідэя спадабалася ўсёй здымачнай групе. Сюжэт — пра тое, як на пачатку XX стагоддзя прадпрымальнік Рыхард Штрэмер прыехаў на Беларусь і паспрабаваў тут здымаць і дэманстраваць фільмы. Рэжысёр вызначыў жанр як «салонную меладраму з нападам жарсцяў». Стужка даўжынёй у 26 хвілін, у ёй пераплеценыя і мастацкі вымысел, і дакументальныя кадры.

Выканаўца ролі Рыхарда Штрэмера акцёр Аляксандр Дзешчыц расказаў, што творчы працэс фільма быў вельмі цікавы, усіх здзівіў незвычайны сімбіёз — мінулае і сучаснасць, гульня артыстаў і хроніка. Тое ж пацвердзіла асістэнт рэжысёра Марына Данейкіна: усё было весела, па-творчаму, у фільме цудоўная каманда і цудоўныя лакацыі. Фільм, на яе думку, закране сэрцы беларусаў, раскажа пра невядомыя старонкі гісторыі. Убачыць яго можна будзе да канца года ў кінатэатрах, потым на тэлебачанні. Натуральна, выйдзе і на стрымінгавыя пляцоўкі. Будуць арганізаваны творчыя сустрэчы са здымачнай групай.

Сярод значных падзей — кінафестываль «Лістапад». Выканаўчы дырэктар кінафестывалю Алеся Рулькова нагадала, што ў гэтым годзе кінафорум юбілейны, таму будуць пэўныя адметнасці. Адкрыццё і закрыццё пройдзе на сцэне Палаца Рэспублікі. Заяўкі на ўдзел паступілі са 114 краін, камісія аглядае фільмы, але заяўкі прымаюцца яшчэ да 1 верасня. Ёсць змены і ў пераліку кінатэатраў, якія стануць пляцоўкамі для праглядаў. Галоўнай будзе кінатэатр «Перамога», які сёлета адкрыўся пасля рэканструкцыі. Дарэчы, цяпер там ёсць зала на 24 месцы, прызначаная для паказу дакументальнага кіно. Як пляцоўкі фестывалю будуць задзейнічаны таксама мінскія кінатэатры «Мір», «Цэнтральны», «Піянер», «Беларусь».

Людміла ІВАНОВА.

Новыя кнігі

«Сямейнае чытанне» дае казачны ўрок

Беларускія і рускія народныя казкі сабраны пад адну вокладку

У выдавецтве «Мастацкая літаратура» пабачыла свет унікальная па задуме і афармленні кніга — «Любімыя казкі нашых прабабуль». Разам сабраны беларускія народныя казкі ў апрацоўцы Алеся Якімовіча і рускія народныя казкі ў апрацоўцы Аляксея Талстога.

Укладальнік выдання, выпуск якога ажыццёўлены па замове Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь у серыі «Сямейнае чытанне», — вядомы беларускі паэт, празаік, дзіцячы пісьменнік, перакладчык Алесь Бадак. У якасці афармлення ёмістага тома, старонкі якога бацькам, дзядулям і бабулям, ды і самім маленькім чытачам можна гартаць літаральна цэлую зіму, выкарыстаны ілюстрацыі знакамітых, аўтарытэтных кніжных графікаў Беларусі — Юрыя Алісевіча, Уладзіміра Басалыгі, Таццяны Беразенскай, Анатоля Волкава, Вячаслава Валынца, Мікалая Гуціева, Міхаіла Дайлідава, Барыса Заборава, Пятра Калініна, Алены Лось, Кацярыны Першынай, Валянціна Ціхановіча, Анатоля Тычыны, Тамары Шэлест і іншых таленавітых творцаў.

